Державна
Наукова Бібліотека
ім. Короленко. Харків

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ (6006) | 6 лютага 1938 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі. Прамова таварыша Сталіна на ўрачыстым пленуме Маскоўскага Совета, прысвечаным дзесятай гадавіне Чырвонай Арміі.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ: — Перад вялікім юбілеем.

На партыйных канферэнцыях армейскіх большэвікоў.

Рэспубліканская агратэхнічная нарада па ільну.

Насустрач XX гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

АРТЫКУЛЫ:

Э. Локшын. — Цяжкая індустрыя ў 1938 годзе.

Ів. Шапавалаў. — Дом № 10.

З. К. Бейненсон. — Аднаўляем у партыі чэсных комуністаў.

Папкоўскі. — Недаацэнка культмасавай работы на вёсцы.

Т. Зелікаў. — Бясклопатныя кіраўнікі.

І. Міндэль. — Спыніць прастоі вагонаў, навесці парадак на пляцоўках.

А. Лось. — Не дапамагаюць стаханаўцам.

І. Вечар, І. Сымон.—Шырыць вопыт перадавых калгаснікаў.

П. Кавалёў. — «Валачаеўскія дні» (новы фільм вытворчасці Ленфільм).

Пратэст урада СССР па поваду незаконных дзеянняў італьянскіх судовых улад.

ЗА РУБЯЖОМ:

Курс на новыя ваенныя авантуры. Буйныя змены ў германскім урадзе. — У фашысцкай Італіі. — У Лонданскім Камітэце па неўмяшанню.— Класавая барацьба за рубяжом. — Рост стачачнага руху ў Англіі. — Галеча ў польскай вёсцы. — На франтах у Іспаніі.

ПЕРАД ВЯЛІКІМ ЮБІЛЕЕМ

…неабсяжная краіна, увесь вялікі …і народ рыхтуюцца зараз да найтага свята — да 20-годдзя Рабо…янскай Чырвонай Арміі і Ваенна…ога Флота.

…год назад партыя Леніна—Сталіна …амогай усіх працоўных стварыла …ю і адзіную ў свеце Чырвоную …, якая ва ўпартых баях за соцыя… заваявала сусветна-гістарычныя …гі. Чырвоная Армія з гонарам …ла бязмерна пяжкі шлях грама…ай вайны, шлях барацьбы з пол…мі белагвардзейскіх армій і за…х інтэрвентаў, разграміла і вы… з краіны ўсіх ворагаў, упісала ў …ю совецкай дзяржавы незабыў…старонкі рэволюцыйнага гераізма, …сці і самаадданасці.

…вовная Армія — дзецішча большэ…і партыі. Яна створана і выхавана …мі правадырамі рэволюцыі Леніным …ліным і іх слаўнымі саратнікамі …е і Варашылавым; у ёй увасобле…нахісная арганізаванасць, жалезная …ліна, беззаветная адданасць спра…муізма і непрымірымасць да ўсіх …ў народа.

…20 год свайго існавання дзякуючы …пастаянным клопатам партыі і со…та Урада, дзякуючы асабістым кло…таварыша Сталіна Чырвоная Армія …зарылася ў грозную для ворагаў, …ую рэволюцыйную сілу.

…сваёй прамове на ўрачыстым Пле…Маскоўскага совета ў дзень X га…ы РСЧА таварыш Сталін з выключ…чоткасцю ахарактарызаваў асаблі… Чырвонай Арміі, якія рэзка адроз…ць яе ад усіх армій свету:

Першая і асноўная асаблівасць на… Чырвонай Арміі заключаецца ў …што яна ёсць армія вызваленых …ых і сялян, яна ёсць армія Ка…ніцкай рэволюцыі, армія дыктатуры …гарыята».

…адна армія ў свеце не акружана …любоўю, спачуваннем і падтрым…народа, як Чырвоная Армія. Ні ад…армія не мае такога моцнага тылу, …ша армія. Бо яна з'яўляецца аба…й социялізма, абаронцай сталінскай …ы народаў, абаронцай міру, свабо… незалежнасці ўсіх напыянальнасцей і радзімы, бо яна — косць ад …плоць ад плоці працоўных мас.

…чэ 20 год назад Владзімір Ільіч …, таварачы аб чырвонаармейцах, …сліваў, што «чалавек з ружжом» …гаў наганяць страх на мірных жы…, бо рабочыя і сяляне добра веда…, што «чалавек з ружжом» з'яўляец… верным другам і абаронцай.

…год Совецкі Саюз жыве ва ўмовах …га социялістычнага будаўніцтва. …арная заслуга большэвіцкай партыі і …кай улады заключаецца ў тым, што …далося пазбавіць наш народ на пра… больш 16 год ад ваенных сутык…ленняў яму магчымасць свабодна ка…ціца пладамі мірнай працы. Гэтага …ся дабіцца таму, што СССР цвёр… настойліва праводзіць мірную палітыку, што на варце міру стаіць ма…ія, аснашчаная перадавой тэхнікай, …альваемая жалезным наркомам аба…, бліжэйшым саратнікам таварыша …на К. Е. Варашылавым Чырвоная …я і Ваенна-Марскі Флот.

…ы стаім за мір і адстойваем спра…міру, але мы не баімся пагроз і га…ацкаць ударам на ўдар падпаль…каў вайны». Гэты сталінскі прын…з'яўляецца непахіснай асновай усёй …кі партыі і совецкай улады па …заванню абаронныя магутнасці краі… Совецкаў, па барацьбе за мір.

…сваёй прамове на сходзе выбаршчы… Молатаўскай выбарчай акругі глава …ката Урада тав. В. М. Молатаў за…:

…«Мы ведаем, хто пяпер спяшаецца …вымі войнамі. Той, у каго дома не …ў парадку, у каго справы тра…ць...»

…лагеры ваяўнічага імперыялізма, у …ры фашысцкіх дзяржаў, дзе ўлада …маецца выключна на штыках і лю…тэроры, ідзе ліхарадачная падрых…ка да вайны. Фашысцкія канібалы …ні і марыць аб тым, каб сарваць …ую працу нашага народа, у ваенных авантурах шукаюць яны выратавання, шукаюць выхаду з свайго безнадзейнага становішча.

Фашысцкія лазутчыкі — трацкіска-бухарынскія бандыты і шпіёны — па даручэнню замежных разведак прабавалі падарваць будынак нашай абароны, прабавалі падкапацца пад наша социялістычнае будаўніцтва. Совецкі народ навучыўся біць у лоб фашысцкіх лазутчыкаў. Слаўныя работнікі НКВД на чале з сталінскім наркомам тав. Ежовым знішчылі шматлікія шпіёнскія гнёзды і нястомна выкурваюць фашысцкіх гадзюк з усіх шчылін. Разграміўшы трацкіска-бухарынскую банду, совецкі народ нанёс моцнае паражэнне міжнароднаму фашызму. Совецкі народ жалезнай рукой рыкарчоўвае астаткі наёмнікаў фашызма.

Міжнародны гарызонт пакрыт грозавымі хмарамі. Адна чвэрць чалавецтва ўжо ўцягнута ў вайну. На паўднёвым захадзе Еўропы і на Далёкім Усходзе фашысцкія варвары сеюць смерць і зруйнаванне, аб'яднаныя сілы міжнароднай рэакцыі знішчаюць дзесяткі тысяч мірных людзей.

У гэты момант, калі небяспека вайны ўзрастае з кожным днём, кроўны абавязак кожнага совецкага грамадзяніна, кожнага патрыёта социялістычнай радзімы — усямерна мацаваць абароназдольнасць краіны Советаў, умацоўваць Чырвоную Армію — любімае дзецішча народа.

Совецкі народ не шкадуе ні сіл, ні сродкаў для ўмацавання абаронай магутнасці сваёй вялікай краіны.

На аснове велізарнага росту социялістычнай індустрыі, у рэзультаце двух сталінскіх пяцігодак, тэхнічная аснашчонасць Чырвонай Арміі і ваенна-вытворчыя рэсурсы краіны выраслі ў велізарных размерах. Чырвоная Армія мае выдатнейшыя кадры байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, добра абучаных і да канца адданых партыі Леніна — Сталіна і совецкаму ўраду. Чырвоная Армія мае магутную авіяцыю, артылерыю і механізаваныя часці. Першая Сесія Вярхоўнага Совета СССР зацвердзіла ўтварэнне Народнага камісарыята Ваенна-Марскога Флота. Гэта рашэнне мае першаступеннае значэнне ў справе абароны СССР. Магутная Совецкая краіна будзе мець дастойны яе вялікай справы марскі і акіянскі флот.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з'яўляецца цяпер адной з самых магутных армій свету. «...Яна будзе самай нападаючай з усіх калі-небудзь нападаўшых армій, калі вораг яе прымусіць да гэтага» (Варашылаў).

Сіла і магутнасць Чырвонай Арміі ў тым, што ў нас увесь народ, кожны працоўны зорка сочыць за падкопамі ворагаў, беражэ заваяванні социялізма, стаіць на варце свайго шчаслівага жыцця. Наш 170-мільённы народ татоў грудзю абараняць сваю радзіму. Ён з'яўляецца магутнейшым рэзервам, аплотам і надзейным тылам узброеных сіл краіны Советаў.

Абавязак усіх партыйных і совецкіх арганізацый у дні, якія асталіся да вялікага свята — 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, — усямерна ўзняць абаронную работу сярод шырокіх мас. Неабходна скарыстаць гэтыя дні для ажыўлення работы асоавіяхімаўскіх арганізацый, для далейшага ўкаранення ваенных ведаў у гушчы насельніцтва.

Неабходна азнаёміць працоўных з гісторыяй барацьбы і перамог Чырвонай Арміі, — вучыць масы на слаўных баявых большэвіцкіх традыцыях РСЧА.

Трэба множыць рады выдатнікаў Асоавіяхіма, варашылаўскіх стралкоў, варашылаўскіх коннікаў, значкістаў ГПА і санітарнай абароны. Кожны завод і калгас павінны стаць сапраўднымі крэпасцямі абароны.

Трэба памятаць, што абарона социялістычнай радзімы — свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР.

Сустрэнем 20-годдзе Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота як вялікае ўсенароднае свята, як свята перамогшага народа, грозная сваёй гарачай любоўю да радзімы, магутнага сваім непахісным маральна-палітычным адзінствам.



«Няхай жыве ленінізм!» — Плакат работы мастака Доўгарукава, выпушчаны «ІЗОГІЗ'ам». Фото А. Базілевіча (СФ).

АБ ТРОХ АСАБЛІВАСЦЯХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ПРАМОВА ТАВАРЫША СТАЛІНА НА ЎРАЧЫСТЫМ ПЛЕНУМЕ МАСКОЎСКАГА СОВЕТА, ПРЫСВЕЧАНЫМ ДЗЕСЯТАЙ ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Таварышы, дазвольце вітаць ад імя Цэнтральнага Камітэта нашай партыі байцоў нашай Чырвонай Арміі, байцоў нашага Чырвонага Флота, байцоў нашай Чырвонай Авіяцыі, нарэшце, нашых дапрызыўнікаў, узброеных рабочых СССР.

Партыя ганарыцца, што ёй удалося стварыць з дапамогай рабочых і сялян першую ў свеце Чырвоную Армію, якая ў найвялікшых баях адстойвала і адстаяла свабоду рабочых і сялян.

Партыя ганарыцца, што Чырвонай Арміі ўдалося з гонарам прайсці цяжкі шлях найжорсткіх баёў з унутранымі і знешнімі ворагамі рабочага класа і сялянства нашай краіны, што ёй удалося аформіцца ў найвялікшую баявую рэволюцыйную сілу на страх ворагам рабочага класа, на радасць усім прыгнечаным і падняволеным.

Партыя ганарыцца, што Чырвоная Армія, прайшоўшы доўгі шлях вызвалення рабочых і сялян ад ярма памешчыкаў і капіталістаў, заваявала, нарэшце, сабе права святкаваць свой юбілей на дзесятым годзе свайго нараджэння.

Таварышы, у чым сіла, дзе крыніцы сілы нашай Чырвонай Арміі?

У чым заключаюцца тыя асаблівасці, якія карэнным чынам адрозніваюць нашу Чырвоную Армію ад усіх і ўсякіх армій, калі-небудзь існаваўшых у свеце? У чым тыя асаблівасці, якія складаюць крыніцу сілы і магутнасці нашай Чырвонай Арміі?

Першая і асноўная асаблівасць нашай Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна ёсць армія вызваленых рабочых і сялян, яна ёсць армія Кастрычніцкай рэволюцыі, армія дыктатуры пролетарыята. Усе дагэтуль існаваўшыя арміі, які-б яны ні мелі састаў, з'яўляюцца арміямі зацверджання ўлады капітала. Яны былі і асталіся арміямі панавання капітала. Буржуа ўсіх краін хлусяць, калі гавораць, што армія палітычна нейтральна. Няверна гэта. У буржуазных дзяржавах армія пазбаўлена палітычных правоў, яна адхілена ад палітычнай арэны, гэта верна. Але гэта зусім не значыць, што яна нейтральна палітычна. Наадварот, заўсёды і ўсюды, ва ўсіх капіталістычных краінах армія ўцягвалася і ўцягваецца ў палітычную барацьбу, служачы зброяй падаўлення рабочых. Хіба гэта няверна, што армія падаўляе там рабочых, што яна служыць там аплотам паноў? У адрозненне ад такіх армій, наша Чырвоная Армія мае тую асаблівасць, што яна з'яўляецца зброяй зацверджання ўлады рабочых і сялян, зброяй зацверджання дыктатуры пролетарыята, зброяй вызвалення рабочых і сялян ад ярма памешчыкаў і капіталістаў. Наша армія ёсць армія вызвалення працоўных.

Ці звярнулі вы ўвагу, таварышы, што ў стары час, ды і цяпер у капіталістычных краінах народ баяўся і прадаўжае баяцца арміі, што паміж народам і арміяй існуе перашкода, якая адгараджвае армію ад народа. Ну, а ў нас? У нас наадварот, народ і армія складаюць адно цэлае, адну сям'ю. Нідзе ў свеце няма такіх любоўных і клапатлівых адносін з боку народа да арміі, як у нас. У нас армію любяць, яе паважаюць, аб ёй клапоцяцца. Чаму? Таму, што ўпершыню ў свеце рабочыя і сяляне стварылі сваю ўласную армію, якая служыць не панам, а былым рабам, цяпер вызваленым рабочым і сялянам.

Вось дзе крыніца сілы нашай Чырвонай Арміі.

А што значыць любоў народа да сваёй арміі? Гэта значыць, што такая армія будзе мець мацнейшы тыл, што такая армія з'яўляецца непераможнай. Што такое армія без моцнага тылу? Нішто. Самыя вялікія арміі, самыя ўзброеныя арміі развальваліся і ператвараліся ў прах без моцнага тылу, без падтрымання і спачування з боку тылу, з боку працоўнага насельніцтва. Наша армія ёсць адзіная ў свеце, якая мае спачуванне і падтрыманне з боку рабочых і сялян. У гэтым яе сіла, у гэтым яе моц.

Вось чым, перш за ўсё, наша Чырвоная Армія адрозніваецца ад усякіх іншых армій, існаваўшых і існуючых у свеце.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць Чырвонай Арміі, гэта яе блізасць, яе брацкая сувязь з рабочымі і сялянамі, была захавана і замацавана за нашай Чырвонай Арміяй.

Другая асаблівасць нашай Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна, наша армія, з'яўляецца арміяй брацтва паміж народамі нашай краіны, арміяй вызвалення прыгнечаных народаў нашай краіны, арміяй абароны свабоды і незалежнасці народаў нашай краіны. У стары час звычайна арміі выхоўваліся ў духу шавінізма, у духу захватніцтва, у духу неабходнасці падняволь ваць чужыя народы. Гэтым уласна і тлумачыцца, што арміі старога тыпу, арміі капіталістычныя былі разам з тым арміямі каланіяльнымі. У гэтым заключалася адна з асноўных слабасцей старых армій. Наша армія карэнным чынам адрозніваецца ад каланіяльных армій. Уся яе сутнасць, увесь яе лад грунтуюцца на ўмацаванні уз дружбы паміж народамі нашай краіны, на ідэі вызвалення прыгнечаных народаў, на ідэі абароны свабоды і незалежнасці социялістычных рэспублік, уваходзячых у склад Совецкага Саюза.

У гэтым другая і асноўная крыніца сілы і магутнасці нашай Чырвонай Арміі. У гэтым зарука таго, што наша армія ў крытычную хвіліну знойдзе найвялікшае падтрыманне ў мільённых масах усіх і ўсякіх нацыянальнасцей, насяляючых нашу неабсяжную краіну.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць таксама была захавана і замацавана за нашай Чырвонай Арміяй.

Нарэшце, трэцяя асаблівасць Чырвонай Арміі. Заключаецца яна ў духу інтэрнацыяналізма, у пачуццях інтэрнацыяналізма, якія прасякаюць ўсю нашу Чырвоную Армію. У капіталістычных краінах арміі звычайна выхоўваюцца ў духу нянавісці да іншых народаў, у духу нянавісці да іншых дзяржаў, у духу нянавісці да рабочых і сялян іншых краін. Для чаго гэта робіцца? Для таго, каб ператварыць армію ў паслухмянае стада ў выпадку ваенных сутычак паміж дзяржавамі, паміж краінамі. У гэтым крыніца слабасці ўсіх капіталістычных армій. Наша армія пабудавана на зусім іншых падставах. Сіла нашай Чырвонай Арміі, таварышы, заключаецца ў тым, што яна выхоўваецца з першага-ж дня свайго нараджэння ў духу інтэрнацыяналізма, у духу павагі да іншых народаў, у духу любві і павагі да рабочых усіх краін, у духу захавання і зацверджання міру паміж краінамі. І іменна таму, што наша армія выхоўваецца ў духу інтэрнацыяналізма, у духу адзінства інтарэсаў рабочых усіх краін, іменна таму яна, наша армія, з'яўляецца арміяй сусветнай рэволюцыі, арміяй рабочых усіх краін. І тое, што гэта акалічнасць з'яўляецца крыніцай сілы і магутнасці нашай арміі, аб гэтым даведаюцца калі-небудзь буржуа ўсіх краін, калі яны адважацца напасці на нашу краіну, бо яны ўбачаць тады, што наша Чырвоная Армія, выхаваная ў духу інтэрнацыяналізма, мае безлічную колькасць прыяцеляў і саюзнікаў ва ўсіх частках свету, ад Шанхая да Нью-Ёрка, ад Лондана да Калькуты.

Вось, таварышы, трэцяя асноўная асаблівасць, якая прасякае дух нашай арміі і стварае крыніцу яе сілы і магутнасці.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць таксама была захавана і замацавана за нашай арміяй.

Гэтым тром асаблівасцям абавязана наша армія тым, што яна ведае, куды ідзе,—тым, што яна складаецца не з алавяных салдат, а з людзей свядомых, разумеючых, куды ісці і за што біцца.

Але армія, ведаючая, за што яна змагаецца, непераможна, таварышы.

Вось чаму наша Чырвоная Армія мае ўсе падставы быць лепшай у свеце арміяй.

Няхай жыве наша Чырвоная Армія!

Няхай жывуць яе байцы!

Няхай жывуць яе кіраўнікі!

Няхай жыве дыктатура пролетарыята, якая нарадзіла Чырвоную Армію, дала ёй перамогу і ўвянчала яе славай!

(Бурныя працяжныя апладысменты).

(Апублікавана ў «Правде» 28 лютага 1928 года).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АГРАТЭХНІЧНАЯ НАРАДА ПА ІЛЬНУ

…чора ў Доме Урада адкрылася рэспуб…анская нарада аграномаў і калгаснікаў-…ванаўцаў ільнаводства. На нарадзе …сутнічае каля 400 чалавек, у тым лі… 158 старшынь, брыгадзіраў, адказных …ільну і звенняўых перадавых ільнавод… калгасаў БССР.

…Удзельнікі нарады заслухалі даклад аб …прыемствах па павышэнню ўраджай…ці ільну, аб ролі аграномаў і іх адказ…ці за выкананне тэхнічных мерапрыем…каў.

…У дакладзе адзначана, што калгасы …СР усё яшчэ недапушчальна адстаюць …ад агульнасці ўраджайнасці ільну, шмат дзе …ацуюцца агратэхнічныя мерапрыемствы, …аномы і навуковыя работнікі слаба …зваюць дапамогу калгаснікам у іх ба…ьбе за высокі ўстойлівы ўраджай ільну. …Выступіўшыя ў спрэчках — аграном …ршамайскай МТС, Сенненскага раёна, …в. Кукса, адказныя па ільну калгаса …Чырвоны сормавец», Чэрыкаўскага раёна, …-гадовы тав. Сіманаў і калгаса імя Лунарскага, Кіраўскага раёна, тав. Ганчароў, звяняя з калгаса імя Леніна, Чавускага раёна, тав. Цыганкова і іншыя падзяліліся вопытам сваёй работы, расказалі, як яны змагаюцца за высокі ўраджай ільну ў гэтым годзе.

— У мінулым годзе, — расказвае Вера Цыганкова, — з аднаго гектара я зняла падвойны ўраджай ільну. Першы раз атрымала 9,9 цнт. ільнавалакна, а другі раз — 27,7 цнт. трасты. Гэты вопыт я думаю ў больш шырокіх размерах, на плошчы 5 гектараў, правесці і ў гэтым годзе. 5 ільнаводчых звенняў нашага калгаса паставілі сабе мэтай дабіцца з рэкордных участкаў не менш 15 цнт. ільнавалакна з гектара. Мы сабралі ўжо 5 тон попелу і 2 топы птушынага памёту.

Кожны з выступаючых адзначыў, што не ўсе аграномы яшчэ па-сапраўднаму ўключыліся ў разгарнуўшаяся социялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, яны мала аказваюць дапамогі ў арганізацыі работы брыгад, звенняў, у наладжанні агратэхнічнай вучобы калгаснікаў.

Сёння нарада прадаўжае сваю работу.

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ АРМЕЙСКІХ БОЛЬШЭВІКОЎ

4 лютага закончыла сваю работу партыйная канферэнцыя Н-скага стралковага корпуса. Першае пытанне павесткі дня — вывучэнне гістарычных рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Дэлегаты ў сваіх выступленнях аднадушна адабралі рашэнні Пленума — дакумент сталінскай мудрасці, ускрывалі памылкі, якія былі дапушчаны партарганізацыямі пры выключэнні комуністаў з партыі.

Сур'ёзную ўвагу дэлегаты канферэнцыі ўдзялілі пытанням павышэння ідэйнага ўзроўню кожнага комуніста. Выступаўшыя таварышы адзначалі, што ў радзе партарганізацый нездавальняюча праводзіцца работа па ўцягненню лепшых байцоў і камандзіраў у рады нашай большэвіцкай партыі.

Тайным галасаваннем выбрана партыйная камісія ў складзе 7 чалавек. Сярод іх — ордэнаносец, член партыі з 1919 года тав. Ткачэнка, лейтэнант тав. Смірноў і іншыя. Сакратаром парткамісіі выбран актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, член партыі з 1919 года тав. Макушын.

Работа канферэнцыі паказала гатоўнасць партыйных арганізацый па-большэвіцку выконваць рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна.

***

Закончыла сваю работу 23-я партыйная канферэнцыя Н-скай дывізіі. Работа канферэнцыі праходзіла на высокім палітычным узроўні, пры разгорнутай большэвіцкай крытыцы і самакрытыцы. Выступаўшыя ў спрэчках таварышы ўскрывалі недахопы ў рабоце партыйных арганізацый і дывізійнай партыйнай камісіі.

У прапановах комуністы намячалі канкрэтныя мерапрыемствы па хутчэйшаму выкананню пастаноў Пленума ЦК ВКП(б). У прынятай рэзалюцыі партканферэнцыя адзначыла недастатковы рост партыйных арганізацый, асабліва за лік лепшых комсамольцаў.

Тайным галасаваннем выбрана партыйная камісія ў складзе лепшых армейскіх большэвікоў дывізіі.

(БЕЛТАЎ).

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

У ГОНАР 20-ГОДДЗЯ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Горсовет Асоавіяхіма выпусціў 180 інструктароў ПІХА, якія абавязаліся да юбілейных дзён 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота падрыхтаваць новых значкістаў ПІХА. Кіраўнікі стралковых гурткоў на прадпрыемствах таксама абавязаліся падрыхтаваць выпуск значкістаў варашылаўскага стралка 1 ступені.

8 лютага група студэнтаў педагагічнага інстытута накіроўваецца ў лыжны пераход, прысвечаны 20-годдзю РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. Маршрут пераходу: Віцебск—Орша—Магілеў—Менск. У гэтых гарадах удзельнікі пераходу прымуць удзел у стралковых спаборніцтвах. Апрача таго па шляху з Магілева ў Менск яны будуць збіраць матэрыял, звязаны з гераічным паходам у часе грамадзянскай вайны 27-ай Омскай дывізіі.

Актывістамі Асоавіяхіма на прадпрыемствах праводзяцца гутаркі па тэму аб 20-годдзі Чырвонай Арміі.

За час падрыхтоўкі да слаўнай гадавіны віцебская арганізацыя Асоавіяхіма вырасла на 3.200 членаў.

ЖОНКІ ЧЫГУНАЧНІКАЎ— АКТЫВІСТКІ АБАРОННАЙ РАБОТЫ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Жонкі чыгуначнікаў уключыліся ў актыўную падрыхтоўку да 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Яны адзначаюць гэту дату ўзмацненнем абаронай работы. Так, на пасёлку «Чырвоны Кастрычнік» днямі арганізаваліся тры новыя групы самаабароны ПІХА, у якія ўваходзяць хатнія гаспадыні — жонкі чыгуначнікаў. У гэтых групах, апрача спецыяльнай падрыхтоўкі праводзяцца гутаркі аб гераічным шляху РСЧА. У гонар падрыхтоўкі да слаўнага юбілея актывістка — жонка машыніста паравозніга дэпо тав. Еўмененка абавязалася дабіцца выдатных паказальнікаў вучобы ў групе самаабароны, у якой яна з'яўляецца інструктарам. У групах таксама ідзе спаборніцтва на злачу да юбілейных дзён норм на значкі ПІХА.

КАЛГАСНІКІ ЗДАЮЦЬ НОРМЫ НА АБАРОННЫЯ ЗНАЧКІ

Калгаснікі калгаса «Прамень комуны», Слуцкага раёна, рыхтуюцца да слаўнага 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Вялікую работу праводзіць пярвічная арганізацыя Асоавіяхіма. У калгасе працуюць гурткі ПІХА, стралковы і інш. Каля 40 калгаснікаў здаюць нормы на абаронныя значкі. У калгасным піры часта правозіцца стралковая трэніроўка. Лепшыя стралкі калгаса тт. Ногіч, Ляўковіч, Пратасеня Міхаіл і Пратасеня Пятро будуць змагацца за першае месца ў раённых стралковых спаборніцтвах імя 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

СПЫНІЦЬ ПРАСТОІ ВАГОНАЎ, НАВЕСЦІ ПАРАДАК НА ПЛЯЦОЎКАХ

Своечасовая пагрузка і выгрузка вагонаў — рашаючая ўмова выканання плана перавозак. Ад гэтага залежыць паскарэнне абароту вагонаў, а значыць рост колькасці перавазімага грузу.

Асобныя кліенты горада Менска нясвоечасова выгружаюць прыбываючыя ў іх адрас вагоны з грузам, а таксама не вывозяць грузаў з пакгаузаў станцыі менскага чыгуначнага вузла. На менскім чыгуначным вузле (ст. Менск-таварная і пасажырская) на 2 лютага знаходзілася невыгружаных каля 500 вагонаў.

15 студзеня г. г. у адрас цагельных заводаў №№ 1, 2, 3, 4, 5 і клінкернага завода прыбыў 601 вагон торфу, але кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў не паклапаціліся вывезці яго нават да 31 студзеня. З 30 студзеня на станцыі стаіць вагон фасфарытнай мукі для соўгаса «Комсамолец». Дырэктар соўгаса не спяшаецца з выгрузкай угнаення.

Дырэктыва партыі і ўрада аб круглясутачнай пагрузачна-разгрузачнай рабоце чыгуначнага транспарта і кліентуры не выконваецца. Кліентура горада Менска не толькі не праводзіць кругласутачнай работы, але нават па выходных днях спыняе ўсякую грузавую работу.

Асобныя наркаматы, як Наркаммясцпром, Наркамхарчпром і інш., не цікавяцца як іх прадпрыемствы выконваюць свае абавязкі перад чыгуначным транспартам, якое становішча складаў на станцыі. Між тым становішча складской гаспадаркі выключна дрэннае. Складаў нехапае і замест таго, каб выгружаць грузы адразу з вагона ў склады, кліентура возіць прыбываючы тавар у горад, затрымліваючы вагоны і плоцячы велізарныя сумы грошай за іх прастоі. Пагрузку і выгрузку кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый перадаверылі другарадным асобам — экспедытарам, а самі гэтым не займаюцца.

Найбольш злосныя кліенты, зрываючыя своечасовую пагрузку і выгрузку вагонаў, прыцягваюцца транспартнай пракуратурай да крымінальнай адказнасці. Былы загадчык хлебным гарадком менскага Заготзярно Фішман І. штучна закансерваваў склады непатрэбнымі грузамі і доўга не выгружаў прыбываючыя вагоны ў адрас Заготзярно. Ён наўмысля не набіраў кадраў грузчыкаў. За палову 1937 года вагоны ў яго прастаялі некалькі тысяч гадзін. Лінейным судом Фішман асуджан на 20 год турэмнага зняволення.

Дырэктар завода «Беларусь» Левін і экспедытар Грэйбо за перыяд верасень-кастрычнік 1937 года дапусцілі перапрастой 243 вагонаў (1091 вагонагадзіна) з рознымі грузамі, прыбываючымі ў іх адрас. Завод уплаціў штрафу чыгунцы 7.730 рублёў. Левін і Грэйбо прыцягваюцца зараз да крымінальнай адказнасці.

Толькі за адзін кастрычнік мінулага года па віне былога дырэктара базы Менхарчгандля Шэрмана І. і былога экспедытара Врублеўскага П. 63 вагоны прастаялі 2461 вагонагадзіну. За гэта чыгунцы было ўплочана 9.305 рублёў штрафу.

Шэрман і Врублеўскі асуджаны на 1 год пазбаўлення волі кожны.

Ёсць выпадкі, калі не толькі кліентура, але і асобныя работнікі чыгункі зрываюць выкананне планаў пагрузкі і выгрузкі. Начальнікам станцыі Менск-747 кілометра працаваў Лапчынскі В., які свядома разваліў работу на гэтай станцыі. Ён не ствараў умоў для работы рабочым, чым выклікаў пякучасць. Лапчынскі падаваў вагоны не ў патрэбныя пункты, чым зніжаў абарот. Замест правільнай арганізацыі работы па абслугоўванню кліентуры, ён свядома не павегамляў ім аб прыбыцці ў іх адрас вагонаў з грузам, каб выклікаць перапрастоі. Па віне Лапчынскага на станцыі меўся рад выпадкаў аварый і крушэнняў. Лінейным судом Заходняй чыгункі Лапчынскі асуджан.

Пара, нарэшце, чыгунцы і кліентуры навесці парадак на пагрузачна-разгрузачных пляцоўках. Пара пакончыць з перапрастоямі вагонаў.

І. МІНДЭЛЬ.

БЯСКЛОПАТНЫЯ КІРАЎНІКІ

Тэхніка безапаснасці і ахова працы рабочага ёсць адзін з тых участкаў, дзе ворагі народа асабліва шкодзілі. Але на радзе прадпрыемстваў і да гэтага часу не ўзяліся за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў гэтай галіне.

На менскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава адміністрацыя (дырэктар т. Бэйвель) мала ўвагі аддае стварэнню спрыяючых умоў працы.

У новапабудаваным мэблевым цэху № 2 працуе больш 150 чалавек. Цэх затоўнен дубовым пылам. Рабочыя кожныя 20—30 хвілін вымушаны выходзіць на вуліцу, бо атрутны дубовы пыл не дае магчымасці працаваць.

Не раз рабочыя зварачаліся да кіраўнікоў завода і асабліва да інспектара па тэхніцы безапаснасці тав. Мацкевіча, каб неадкладна зрабіць высасваючыя вентылятары. Але заўсёды атрымліваюць безапаможны адказ: «Няма сродкаў». На самай-жа справе з вызначаных у 1937 г. на тэхніку безапаснасці 5.700 рублёў выдаткавана толькі 4.000.

Вентылятараў няма і ў механічным аддзяленні мэблевага цэха.

Калі стахановец першага мэблевага цэха т. Штанюк звярнуўся да дырэктара завода тав. Банвеля з просьбай устанавіць для яго станка высасваючы вентылятар (бо інакш працаваць немагчыма), то дырэктар... пазбавіў яго спецхарчавання.

Зусім дрэнна ўстаноўлена агарожа ля станкоў з вялікай колькасцю абаротаў, што вельмі небяспечна. Ля большасці станкоў агарожа драўляная, што ніколькі не гарантуе безапаснасць. Ёсць станкі, якія зусім не маюць агарожы. Так, у ланцуговым станку механічнага аддзялення (першы мэблевы цэх) ні матор, ні рамні не агарожаны. У сушыльным цэху маторы зусім адкрытыя.

Цэлымі кавалкамі ападае атынкоўка са столі механічнага цэха. У лакіровачным аддзяленні тэмпература паветра дасягае 30 градусаў цяпла. З-за адсутнасці на месцы хавальні за фарбай і лакам рабочым прыходзіцца ісці за 500 метраў ад цэха.

Да станкоў вельмі часта ставяць некваліфікаваных рабочых. Рабочы Захарэвіч, які быў пастаўлен на работу ў заготоўчым цэху, з за тэхнічнай няграмотнасці, цяжка пакалечыў руку. Тое-ж было і з маладым некваліфікаваным рабочым Казловічам.

Цэхі загружаны непатрэбнымі матэрыяламі, бракам. Ля кожнага станка, асабліва ў першым мэблевым цэху, ляжаць груды польтаў рабочых, бо вешалак няма. Зусім адсутнічаюць умывальнікі і гатаваная вада для піцця.

На заводзе ёсць душ для рабочых, але вады ў ім ніколі не бывае. Жаночае аддзяленне ў душы (на адну асобу) не апяляецца.

Трэба дадаць, што за дрэнную пастаноўку тэхнікі безапаснасці на заводзе быў асуджан умоўна тэхнічны дырэктар Тацьянок, але гэта ніколькі не паслужыла яму ўрокам.

Т. ЗЕЛІКАЎ.

ЗАКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ

МАСКВА, 4 лютага. (БЕЛТА). Сёння закончыў сваю работу IV пленум Цэнтральнага совета саюза ваяўнічых бязбожнікаў, які прадаўжаўся чатыры дні. Прынята разгорнутае рашэнне, накіраванае на рашучае паляпшэнне работы мясцовых арганізацый саюза ваяўнічых бязбожнікаў.

Пленум зацвердзіў інструкцыю для первічных арганізацый Саюза і палажэнне аб масавай антырэлігійнай рабоце ў школе.

Байцы-выдатнікі аддзялення разведкі Н-скай ваеннай часці. На здымку (справа налева): тт. **Фізікаў, Гарбузоў і Шаталаў** на занятках. Фото Я. Салавейчыка.

ШКОЛА МАЙСТРОЎ ТРАПНАГА АРТЫЛЕРЫЙСКАГА АГНЮ

Камандзіру дадзена заданне—знішчыць агнявыя пункты праціўніка, якія перашкаджаюць наступленню Н-скага стралковага палка.

Скрозь вузкую шчыліну назіральнага пункта ў алтычным прыборы паказваецца бліжэйшы рубеж, заняты нашымі часцямі. За ракой у досвітнай дымцы вырысоўваецца сцяна лесу, ледзь улоўныя абрысы «непрыяцельскай» вёскі. Там праходзіць лінія абароны «праціўніка». У бінокль відаць пошугі агню гармат. Даносіцца часты трэск кулямётаў. «Праціўнік» вядзе абстрэл пераправы праз раку, якую фарсуе наша наступаючая пяхота.

Камандзір шыбка арыентуецца ў абстаноўцы і перадае батарэі загад. З назіральнага пункту яму відаць, як узнімаюцца дымкі разрываў. Чотка карэктуючы стральбу, ён прымушае батарэю «праціўніка» змоўкнуць. Задача выканана на вылатна.

Пачынае змяркацца. З-за павароту, па лініі чыгункі, якую відаць у алтычным прыборы, паволі рухаецца бронепоезд. Злева па полю ідуць танкі...

Усё гэта здбываецца ў адной з добра абсталяваных аўдыторый Ваенна-артылерыйскай акадэміі РСЧА імя Дзержынскага. Рухам танкаў, бронепаязлоў, пяхоты і кавалерыі, гарматнай стральбой, асвятленнем і нават пагодай кіруе тэхнік, які сядзіць за пультам. Слухачы акадэміі — камандзіры Чырвонай Арміі — заняты практычнай вучобай. Яны з поспехам авалодваюць майстэрствам трапнага агню ў любых умовах.

Ваенна-артылерыйская акадэмія — адна з старэйшых ваенных вучэбных устаноў краіны. Яна аснавана ў 1820 годзе. Гісторыя яе неразрыўна звязана з гісторыяй развіцця артылерыі.

Акрамя палігона, апісанага вышэй, Акадэмія мае шматлікія лабараторыі. Тут камандзіры Чырвонай Арміі на практыцы вывучаюць тэхналогію метала, оптыку, балістыку і іншыя складаныя дысцыпліны, вядуць навукова-даследчую работу.

За пяць год вучобы, апрача спецыяльнай падрыхтоўкі, слухач атрымлівае ў акадэміі вышэйшую тэхнічную асвету. Ён набывае абшырныя веды па спецыяльных і агульнаадукацыйных прадметах, авалодвае замежнымі мовамі.

Тысячы выхаванцаў Акадэміі, прыйшоўшыя з фронтаў грамадзянскай вайны, з школ чырвоных камандзіраў, сталі камандзірамі дывізій, брыгад і палкоў, прафесарамі і дацэнтамі, выдатнымі канструктарамі, дырэктарамі заводаў. Лепшыя з іх узнагароджаны ўрадам ордэнамі Совецкага Саюза.

Ленінград, 4 лютага.

ДЭПУТАТ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР тав. ЛЁЛІНА Н. С. ВЫБРАНА СТАРШЫНЕЙ АСІПАВІЦКАГА РВК

АСІПОВІЧЫ. Райком партыі прыняў у кандыдаты партыі дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Лёліну Надзежду Сямёнаўну.

З лютага на пленуме Асіпавіцкага райвыканкома, тайным галасаваннем тав. Лёліна выбрана старшынёй Асіпавіцкага райвыканкома.

Тав. ВЛАСЕНКАЎ ПРЫНЯТ У КАНДЫДАТЫ ПАРТЫІ

ВІЦЕБСК, 4 лютага. (Кар. «Звязды»). Бюро Віцебскага сельскага райкома партыі на сваім пасяджэнні 4 лютага зацвердзіла пастанову партгрупы Міхалёўскага сельсовета аб прыняцці ў кандыдаты партыі спачуваючага тав. Власенкава Кірылу Патапавіча, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР.

С. Б.

ЛЮДЗІ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ

УШАЧЫ. Днямі на райпартсходзе прынят у кандыдаты партыі трактарыст калгаса «Чырвоны Востраў» тав. Крыкезіч. У часе выбараў у Вярхоўны Совет ён быў членам акруговай выбарчай камісіі і актыўна працаваў на ўчастку.

У кандыдаты партыі прынята таксама камбайнер калгаса «Пераможац», комсамолка тав. Емельянава.

АДНАЎЛЯЕМ У ПАРТЫІ ЧЭСНЫХ КОМУНІСТАЎ

Днямі адбыўся сход Камарынскай раённай партыйнай арганізацыі на якім абмяркоўвалася гістарычная пастанова студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) «Аб памылках, партыйных арганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстараненню гэтых недахопаў».

У сваіх выступленнях комуністы рэзка крытыкавалі райком партыі за дапушчаныя памылкі пры разглядзе партыйных спраў асобных комуністаў. Таварышы адзначалі, што ў партыйнай арганізацыі меліся выпадкі выключэння з партыі без папярэдняй праверкі «кампраметуючых» матэрыялаў.

Комуніст тав. Пугач быў выключан з партыі за «дэзертырства» і «развал» калгасаў. Зараз устаноўлена, што тав. Пугач дэзертырам ніколі не быў, калгас, дзе ён працаваў старшынёй, з'яўляўся перадавым калгасам у раёне. Тав. Пугач пастановай райкома адноўлен у правах члена партыі.

Член партыі тав. Пашун працаваў парторгам пярвічнай партыйнай арганізацыі калгаса «Ніжні Дняпровец». Райком партыі атрымаў кампраметуючую заяву на тав. Пашуна. Яго абвінавачвалі ў цесным сувязі з варожымі элементамі. Паклёпнікі нават указвалі прозвішчы людзей, «чужых элементаў», з якімі, нібы ён быў звязан. Замест праверкі пастуўшых заяў былое кіраўніцтва райкома партыі неадкладна выключае тав. Пашуна з радоў партыі. Пры паўторным разборы партыйнай справы тав. Пашуна, высветлілася, што «варожыя» людзі, у сувязі з якімі яго абвінавачвалі, з'яўляюцца... актыўнымі калгаснікамі-стахановцамі. Тав. Пашун таксама адноўлен у радах партыі.

Да парторга партарганізацыі калгаса «Чырвоны будаўнік» тав. Данілёнка дайшлі чуткі, што ў калгасе «Чырвоны будаўнік» загінула 10 га ільну. Старшыня гэтага калгаса комуніст тав. Блудчык даказваў сваю невіноўнасць, хлуслівасць абвінавачвання, патрабаваў дэталёва праверыць факты. Аднак на сходзе пярвічнай партарганізацыі ставіцца пытанне аб партыйнасці тав. Блудчага. Яго выключ з радоў партыі.

Праз некалькі дзён у калгас пр старшыня райвыканкома тав. Сцеп і адказны сакратар РВК тав. Буднік склікалі агульны сход калгаснікаў гэтым сходзе Буднік у сваім выступ заявіў: «Блудчы — вораг народа трэба зняць з пасады старшыні, а к знімеце, то ўжо стаіць машына, яго павязем...» Праўда, калгаснікі ьерылі такой паклёпніцкай заяве, а чальства настаяла, і тав. Блудчы знят з работы старшыні калгаса.

Райком партыі заняўся высвят фактаў абвінавачвання тав. Бл Устаноўлена, што ўсе гэтыя фа хлусня, што вымушан быў прыз сам парторг тав. Данілёнка. Тав. адноўлен у радах партыі. А за гэтыя факты атрымаў суровае спагнанне і знят з работы.

Характэрна прывесці наступны У партарганізацыі, прыкрываючыся волюцыйнай пільнасцю», пакл на чэсных комуністаў былы чле тыі Шмат. У сваіх заявах ён а дзесяткі ні ў чым не віноўных кандыдатаў партыі —бандытамі, лянтамі, пасобнікамі ворагаў, цесна нымі з ворагамі і т д. Праверкай ноўлена, што Шмат сам быў песна з выкрытымі ворагамі народа, п сабе калгасныя гропы 1.700 рубл дучы старшынёй калгаса «Чырвоны займаўся злоўжываннямі і очкаўці ствам. Сваю варожую дзейнасць ён ваў крыкамі аб «рэволюцыйнай п ці». Райком партыі выкрыў гэтага п ніка і выключыў яго з партыі.

Пастанова студзеньскага Пленум ВКП(б) яшчэ больш мабілізоўвае п ную арганізацыю на неадкладнае в лене дапушчаных памылак, на ў ідэйна-палітычнага ўзроўню кожнага ніста, на павышэнне рэволюцыйнай насці, каб да канца выкрыць і вы ваць ворагаў народа, у якую-б масі ні адзяваліся.

З. К. БЕЙНЕНС
сакратар Камарынскага райкома партыі.

НЕДААЦЭНКА КУЛЬТМАСАВАЙ РАБОТЫ НА ВЁ

У дні падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР працоўныя Уздзенскага раёна на справе паказалі зялікую палітычную актыўнасць. За гэты адказны перыяд значна палепшылася палітычна-масавая работа на вёсцы. Пярвічныя партыйныя арганізацыі аператыўна кіравалі палітычнай агітацыяй сярод калгаснікаў.

Выраслі выхатныя, новыя агітатары не толькі з комуністаў і комсамольцаў, але і з беспартыйнага актыва, які дказаў сваю бязмежную адданасць вялікай партыі Леніна — Сталіна. Калі ў мінулыя гады працавала толькі 50 агітатараў і то выключна члены партыі, то зараз партыйныя арганізацыі маюць палітычна падрыхтаваных агітатараў 241 чал. Сярод іх 55 таварышаў непартыйных большэвікоў.

Для дапамогі ў складанай рабоце агітатарам у сельсоветах арганізаваны агітколектывы. Амаль кожны дзень работнікі райкома і райвыканкома выязджаюць з дакладамі на семінары агітатараў. Палітычная агітацыя спаткала надзвычайна вялікую зацікаўленасць калгаснікаў. Даклады аб міжнародным становішчы на сходах калгасаў «Чырвоны барацьбіт» «Комунар», «Звязда», імя Дзержынскага і іншых праходзілі на высокім палітычным узроўні, прасторныя клубы не ўмяшчалі жадаючых прысутнічаць.

Палітычная агітацыя набывае ўсё больш шырокі размах як па рознастайных формах, так і па росту агітатарскіх кадраў. На палітднях калгаснікаў, у гуртках агітатары вывучаюць гістарычныя рашэнні студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) і вынікі першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

У разгортванні палітычнай агітацыі вялікае месца займае Дом соцкультуры, які павінен быць цэнтрам палітычнага і турнага зыхавання мас соцыялі калгаснай вёскі. Загадчык дома соцк ры — гэта арганізатар масавых ме емстваў, ён абавязан быць палітп культурна падрыхтаваным чалавека

Аднак, трэба з усёй рашучасц краслівць недаацэнку значэння дам цыялістычай культуры партыйным: зацыямі і Наркамасветы. У бол сваёй дамы соцкультуры працуюце лючна дрэнна. У іх адсутнічае неаб матэрыяльная база. На ўвесь го пускаецца для Дома соцкультуры 1.800 рублёў. Сродкаў нехапае д нічнага абслугоўвання. Нават за Дома соцкультуры атрымлівае ў 85 рублёў. Ён вымушан працава сумяшчэнню.

Надзвычай цяжка падабраць пад ваных людзей для работы ў дама культуры. Некалькі месяцаў таму райком партыі накіраваў загадчыка моў соцкультуры 9 членаў партыі. некалькі дзён прышлося трох тава пераводзіць на іншую работу, бо рыяльна яны не былі забяспечаны. нія штодня ходзяць у райком з пр вызваліць іх ад абазязкаў.

Да культурнага фронта прыклад брудныя лапы ворагі народа, якія а лі ў Наркамасветы. Яны імкнуліся нуць палітычную работу на вёсцы. тым не раз сігналізавалі новаму кі тву Наркамасветы. Але справа агульных размоў не ідзе. Пара Н асветы заняцца як след дамамі соцк ры.

ПАПКОЎС
культпроп Уздзенскага райкома

ЦЯЖКАЯ ІНДУСТРЫЯ Ў 1938 ГОДЗЕ

У мінуўшым 1937 годзе работнікі цяжкай індустрыі атрымалі рад новых перамог. Цяжкая прамысловасць, выконваючы рашэнні лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б), на працягу ўсяго года рашуча ачышчалася ад трацкісцка-бухарынскарыкаўскіх агентаў япона-нямецкага фашызма. Да кіраўніцтва прадпрыемствамі і ў наркамат прышлі сотні і тысячы новых людзей, авалодаўшых тэхнікай, адданых справе партыі Леніна—Сталіна. Пад кіраўніцтвам сталінскага наркома цяжкай індустрыі таварыша Л. М. Кагановіча разгарнулася арганізацыйная перабудова, накіраваная на ліквідацыю функцыяналкі і канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва.

Велізарная палітычная актыўнасць мас, звязаная з выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР, спалучалася з вялікім вытворчым уздымам сярод работнікаў цяжкай прамысловасці. Гэтаму спрыяла вялікая работа па разгортванню стаханаўскага руху, па згуртаванню работнікаў цяжкай індустрыі (злёты стахановаў і ўдарнікаў вугальнай прамысловасці, нарада металургаў у Крэмлі, нарада работнікаў меднай прамысловасці ў Свярдлоўску і т. д.).

Усе гэтыя меры ўжо ў 1937 годзе далі свае першыя вынікі. У параўнанні з 1936 годам аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся ў 1937 годзе на 6,8 проц. і, што асабліва важна, амаль увесь прырост прамысловай вытворчасці ў мінулым годзе з'явіўся вынікам павышэння прадукцыйнасці працы. За 1937 год выпрацоўка на аднаго рабочага ў цяжкай індустрыі вырасла ў сярэднім на 6,7 проц.

Было-б, аднак, няверна абыйсці ценявыя бакі работы цяжкай прамысловасці ў мінулым годзе. Гадавы план па валавой прадукцыі быў рэалізован усяго на 88,9 проц. Рад галін, у тым ліку такія важныя, як каляровая металургія, трубная і цэментная прамысловасць на працягу ўсяго года працавалі нездавальняюча. Некаторыя галіны — вугальная, чорная металургія, некалькі палепшыўшы ў апошнія месяцы 1937 года сваю работу, усё-ж не дасягнулі яшчэ планавага ўзроўню.

План работ цяжкай індустрыі ў 1938 годзе высоўвае перад работнікамі важнейшых галін народнай гаспадаркі новыя, надзвычай адказныя задачы. Расшыранае ўзнаўленне ў цяжкай індустрыі ў 1938 годзе павінна быць значна паскорана. **Зацверджаны ўрадам план па валавой прадукцыі прадугледжвае прырост прадукцыі Наркамцяжпрома на 16 проц. у параўнанні з 1937 годам.** Гэта заданне само па сабе вельмі значнае. Стрыжнявая ідэя плана 1938 года, аднак, заключаецца не ў гэтым. Цэнтральны замысел плана — у рашучым паляпшэнні **якасці** ўсёй работы. План цяжкай прамысловасці на 1938 год іменна так і звёрстан, што без рашучага паляпшэння ўсіх якасных паказальнікаў, без крутога павышэння культуры вытворчасці і ўдасканалення арганізацыі працы не змогуць быць рэалізаваны і колькасныя заданні вытворчай праграмы.

Патрабаванне рашучага паляпшэння якасці ўсёй работы цяжкай індустрыі знаходзіць сваё абагуленае выражэнне ў заданні **павысіць у 1938 годзе прадукцыйнасць працы на 14 проц. і знізіць сабекошт на 3,4 проц.**

Важнейшай прадпасылкай выканання гэтага велічнага плана з'яўляецца **далейшае разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва, развіццё і ўмацаванне стаханаўскага руху.** У загадзе «Аб выкананні вытворчага плана Народнага Камісарыята цяжкай прамысловасці на 1938 г.» *) таварыш Л. М. Кагановіч падкрэсліў, што «значная частка гаспадарнікаў і інжынераў не выканалі ўказанняў снежаньскага Пленума ЦК ВКП(б) 1935 года аб стаханаўскім руху, не сталі сапраўднымі арганізатарамі масавага стаханаўскага руху».

Частка гаспадарнікаў дапусціла ў кіраўніцтве стаханаўскім рухам сур'ёзную памылку. Захапляючыся стварэннем патрэбных умоў для дасягнення рэкордаў асобных, асабліва выдаючыхся стаханаўцаў, гаспадарнікі выпусцілі з-пад увагі, што найпершым іх абавязкам з'яўляюцца безупынныя клопаты аб распаўсюджанні стаханаўскіх рэкордаў, што **сіла стаханаўскага руху ў яго масавасці.** ЦК партыі ў сваёй пастанове з поваду звароту стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці ўказаў на гэту памылку. Чэснае яе выпраўленне забяспечыць паляпшэнне кіраўніцтва стаханаўскім рухам. Сістэматычная работа па расшырэнню стаханаўскіх радоў, бесперапыннае пашырэнне стаханаўскага вопыту павінна стаць у гэтым годзе абавязковай састаўной часткай усёй сістэмы работы камандзіраў вытворчасці цяжкай індустрыі. **Стаханаўскія метады павінны стаць асноўнымі метадамі работы прадпрыемстваў.**

Расшырэнне і ўмацаванне стаханаўскага руху мае на мэце рашучае павышэнне культуры вытворчасці, паляпшэнне ўсёй арганізацыі працы. Уменне выжаць з тэхнікі ўсё, што яна можа даць, скарыстаць усе вытворчыя рэсурсы, паставіць іх цалкам на службу соцыялізма — такі асноўны паказальнік высокай культуры вытворчасці. План цяжкай прамысловасці на 1938 год патрабуе, каб было забяспечана **найбольш поўнае скарыстанне ўсіх рэзерваў вытворчых магутнасцей.**

Справіцца з гэтымі заданнямі работнікі цяжкай індустрыі змогуць толькі пры ўмове, калі яны сур'ёзна, па-большэвіцку возьмуцца за ўпарадкаванне **арганізацыі працы.** Работы ў гэтым напрамку яшчэ непачаты крэй. «У арганізацыі працы, — адзначае народны камісар цяжкай прамысловасці тав. Л. М. Кагановіч, — да гэтага часу не зжыты элементарныя недахопы, надзвычай вялікія прастоі механізмаў і абсталявання, частыя зварыі з горнымі выпрацоўкамі, механізмамі і абсталяваннем, што з'яўляецца вынікам не толькі злога намеру ворагаў, але і тэхнічнай неахайнасці, і адсутнасці належнай працоўнай дысцыпліны».

1938 год павінен стаць годам рашучай ліквідацыі ўсіх гэтых недахопаў. **Нашы гаспадарнікі абавязаны выхаваць у сябе пачуццё непрымірымасці да ўсякага роду страт у вытворчасці.** Нельга, у прыватнасці, мірыцца з вялізнымі прастоямі. Лепшая падрыхтоўка і абслугоўванне рабочага месца, забеспячэнне цвёрдага паралку на вытворчасці і т. д. павінны ўжо ў 1938 годзе забяспечыць **зніжэнне прастояў** агрэгатаў і абсталявання не менш чым на 25 проц. Загад народнага камісара цяжкай прамысловасці тав. Л. М. Кагановіча падкрэслівае, што гэта заданне складае адну з галоўных задач кіруючых работнікаў шахт, рудзікоў, промыслаў і заводаў у 1938 годзе.

Вельмі часта прычынай прастояў з'яўляюцца аварыі, якіх усё яшчэ вельмі многа на заводах цяжкай індустрыі. У барацьбе з гэтым злом павінны быць дасягнуты рашучыя поспехі. Каб **скараціць аварыі,** трэба павысіць большэвіцкую пільнасць. Лютаўска-сакавіцкі Пленум ЦК ВКП(б) прапаноўваў уважліва расследаваць не толькі тэхнічныя, вытворчыя прычыны аварый, але і знаходзіць канкрэтных віноўнікаў. Гэта ўказанне Пленума павінна няўхільна выконвацца.

Аварыі — гэта не толькі справа рук ворагаў. Многа аварый адбываецца з-за тэхнічнай расхлябанасці, з-за адсутнасці моцнай працоўнай дысцыпліны. Крыніцай аварыйнасці з'яўляецца таксама неахайная, дрэнная эксплаатацыя абсталявання, пагарджэнне планава-папераджальным рамонтам. Народны камісар цяжкай прамысловасці прапануе таму ўсім начальнікам глаўкаў распрацаваць **цвёрдыя тэрміны перыядычнага рамонту** асноўнага і дапаможнага абсталявання і механізмаў.

Правільная арганізацыя капітальнага і планава-папераджальнага рамонтаў адыграе вялікую ролю ў барацьбе з аварыямі. Асабліва важна, каб цвёрда захоўваўся зацверджаны тэхналагічны рэжым. Усякія адступленні тут толькі ўскладняюць работу, іграюць на-руку ворагу, аблягчаюць яго варожую дзейнасць. Гэта датычыць асабліва тых галін прамысловасці, як хімія, чорная і каляровая металургія, дзе строгапунктуальнае захоўванне тэхналагічнага рэжыма мае выключнае значэнне.

Характэрнай рысай стылю работы цяжкай прамысловасці ў 1938 годзе павінна стаць **барацьба за такую арганізацыю ўсяго працэсу вытворчасці, пры якой усе часткі працавалі-б як адзінае, зладжанае цэлае.** У вугальнай прамысловасці такім фактарам, арганізуючым увесь працэс, з'яўляецца цыкл. Барацьба за цыкл патрабуе рашучага падцягвання тылавых участкаў вытворчасці, канцэнтруе ўвагу на ўзаемнай залежнасці работы асобных участкаў. Гэта цыклу прыстасоўна да ўсіх галін. **Таварыш Л. М. Кагановіч у сваім загадзе патрабуе, каб на ўсіх заводах, электрастанцыях, шахтах, рудніках і промыслах вытворчасць была арганізавана па рэгламентованаму тэхналагічнаму працэсу на падставе цвёрдага, пааперацыйнага графіка.**

Выключна вялікае значэнне для поўнага выканання плана 1938 г. мае завяршэнне арганізацыйнай перабудовы апарата кіраўніцтва. Не заклінаннямі павінны кіраўнікі змагацца з бюракратызмам, а асабіста зжываць кожны факт праяўлення канцылярска-бюракратычнага метаду кіраўніцтва, выхоўваць на гэтых прыкладах работнікаў у духу большэвіцкай самакрытыкі, развіваць у іх пачуццё непрымірымых адносін да бясчынстваў.

Сур'ёзная перабудова метадаў работы павінна быць праведзена і ў галіне **снабжэння** прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці сыравінай, матэрыяламі і апаратам. Гэта работа ў мінулым годзе была арганізавана дрэнна. Трэба канчаткова пакончыць з ураўнілаўкай у размеркаванні матэрыялаў, выдзяляць у якасці першачарговых аб'ектаў снабжэння асноўныя, важнейшыя і вядучыя прадпрыемствы і словасці. Адначасна павінна быць р пакончана з антыгаспадарчай прав атрымання матэрыялаў у запас, «н кі выпадак», яшчэ ўласцівай многі падарнікам.

Важнейшай прадпасылкай выка велізнага задання вытворчай пра 1938 года з'яўляецца **рашучая і пас ная ліквідацыя ўсіх вынікаў шкодн далейшае выкрыццё подлых трац бухарынскіх шкоднікаў, якую-б масі ні надзявалі.**

Народны камісар цяжкай прамысл таварыш Л. М. Кагановіч у сваім з патрабуе, каб работнікі цяжкай пра васці з яшчэ большай упартэцыю і н лівасцю **павышалі палітычную насць, яшчэ больш рашуча ліквідава вынікі шкодніцтва, яшчэ смялей вы ведаючых справу і адданых партыі л**

Перад гаспадарнікамі план 1938 высоўвае складаныя і адказныя з Кіраўніцтва прамысловасцю значна ўс ялася. Справіцца з сваімі абавязкам падарнікі змогуць толькі ў тым вып калі ва ўсёй сваёй рабоце будуць рацца на вытворча-гаспадарчыя ак калі будуць, як вучыць нас тав Сталін, **не толькі вучыць масы, а вучыцца ў іх.**

Тав. Л. М. Кагановіч у сваім з піша, што «наш совецкі гаспадарні карыстаецца давер'ем і любоўю н павінен прапаваць не за страх, а з весць, змагаючыся з недахопамі вы часці, бескультур'ем, недапушчальны носінамі да абсталявання і механізма забяспечыць на аснове адзінана цвёрдую дысцыпліну на вытворчасці

Цяжкая індустрыя — аснова наша цыялістычнай гаспадаркі. Аб ёй нях клапоціцца наша партыя і ўрад, ас таварыш Сталін.

Увага і дапамога партыі абавязв Работнікі цяжкай індустрыі павінны менаваць 1938 год новымі перамог славу соцыялістычнай радзімы.

З. ЛОКШЫН.

*) Загад тав. Л. М. Кагановіча поўнасцю апублікаван у № 23 газеты «Індустрыя» за 1938 год.

...А-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

...ДАПАМАГАЮЦЬ СТАХАНАЎЦАМ

...ульныя годы ў калгасах Мсціслаў... выраслі сотні стахановцаў, якія ...высокіх ураджаяў ільну, зернавых, ...Напрыклад, калгасніца-стахановка ...пелі «XIII Кастрычнік», Шамаў... сельсовета, Агаф'я Фёдараўна Гасен... 1937 годзе атрымала па 10 ...ільнавалакна і 8 цэнтнераў іль... гектара. Звяно Мар'і Іванаўны ...й у калгасе «Правда», на плошчы ...раў зняла па 500 цэнтнераў ...Высокі ўраджай атрымала перада... калгаса «Першае мая», Стара... сельсовета, Аляксея Цімафеевіча ...на. З усёй плошчы брыгада зня... цэнтнераў зернавых з гектара.

...прывесці дзесяткі прыкладаў ...работы перадавых людзей калгас... якія набылі багаты вопыт ба... ўраджай. Зараз іх думкі і імк... кіраваны на тое, як лепш пад... да веснавой сяўбы, атрымаць ...ўраджай, яшчэ больш узняць ...падня. Калі летась калгаснікі ...целі імя Варашылава, Шамаўска... совета, імя Кірава, таралскога со... ...шныя атрымалі на працадзень па ...мау зернавых, 10—12 кілогра... ...бы, то сёлета яны рашылі дабіцца ...12 кілограмаў зернавых, 16—18 ...ў бульбы на працадзень.

...ы, бясспрэчна, яшчэ больш-бы па... калі-б у раёне добра кіравалі ...кім рухам, дапамагалі ў рабоце ...цаў. Аднак, гэтага ў раёне няма. ...ля і совецкія арганізацыі, зямель... і МТС не пралумалі ўсур'ёз пы... ...анізацыі социялістычнага спаборн... калгасах.

...та пытаць у раённым зямельным ...б тым, што робіцца ў перадавых ...брыгадах, звеннях. Гэтага не ве... ні загалчык аддзела тав. Карю... тарны аграном тав. Цыганкоў. ...т невядома колькі калгасаў уклю... ...ў социялістычнае спаборніцтва, ...ганізавана звенняў.

...ацюць раённыя арганізацыі і таго, ...калгасах ёсць стахановцы. Улік ...ца толькі па тых спісах, якія ...ы пры рэгістрацыі ўдзельнікаў ...ўлёту стахановцаў.

...торш справа па аказанню кан... дапамогі стахановцам у іх прак... тычнай рабоце. Аграномы забыліся аб тым, што стахановцы ад іх, у першую чаргу, чакаюць неабходнай дапамогі. Стахановцы жадаюць вывучаць агратэхніку, каб дасягнуць рэкордных ураджаяў. Але агратэхнічныя гурткі арганізаваны толькі ў 12 калгасах. Усіх-жа калгасаў у раёне 157. У большасці іх аграномы не заглядваюць, не дапамагаюць арганізаваць работу ў брыгадах і звеннях.

Кожны дзень у райземадзел і МТС прыходзяць старшыні калгасаў з просьбамі да аграномаў дапамагчы арганізаваць агратэхнічную вучобу. Ужо месяц, як запрашаюць стахановцы ў свой калгас «Першае мая», Рылаўскага сельсовета, участковага агранома тав. Кудрыцкага. Але ўсё дарэмна. Многія аграномы больш сядзяць у канцылярыі, чым выязджаюць у калгасы.

Адсутнасць дапамогі прыводзіць да таго, што абавязацельствы ў асобных калгасах асталіся толькі на паперы. У многіх калгасах яшчэ не арганізаваны звенні, не наладжана работа брыгад, не разгорнута сапраўднае социялістычнае спаборніцтва. Дагаворы па спаборніцтву, як правіла, не правяраюцца. Нават да гэтага часу не заключан дагавор паміж калгасамі Мсціслаўскага і Горацкага раёнаў, хаця выклік на соцспаборніцтва прыняты ўжо каля месяца таму назад раённым злётам стахановцаў.

Як вынік, у раёне ўсё яшчэ слаба разгортваецца падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Ва многіх калгасах яшчэ не закончан абмалот, што запягвае засыпку насення. Многія сельсоветы, як Пацолкаўскі, Мазалаўскі, Доўгавіцкі і інш. план засыпкі насення выканалі толькі ад 56,1 процанта да 88 процантаў. Насення канюшны засыпана 8 процантаў. Тое-ж насенне, якое засыпана, ачышчана толькі на 50 процантаў. Большасць калгасаў раёна не давяло насенне да патрэбнай кандыцыі. План міжкалгаснага гатункаабмену выканан толькі на 14 процантаў.

Зусім дрэнна праходзіць вывазка гною, торфу, збор попелу. Да гэтай работы прыступілі толькі асобныя калгасы. Са станцыі яшчэ не вывезена каля 170 тон розных каштоўных мінеральных угнаенняў.

Пакуль што раённыя арганізацыі Мсціслаўшчыны канкрэтна не ўзначальваюць соцспаборніцтва за высокі ўраджай.

А. ЛОСЬ.

...ШЫРЫЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСНІКАЎ

...ногіх калгасах Слуцкага раёна ...лася социялістычнае спаборніц... высокі ўраджай. Калгаснікі сель... і імя Закоўскага змагаюцца за ...не ў сярэднім з кожнага гек... менш 20 цэнтнераў збожжавых і ...тнераў бульбы.

...наўская брыгада Кіслюка ўзяла ...ельства атрымаць з кожнага ...ў сярэднім 20 цэнтнераў ячме... цэнтнеры пшаніцы і 500 цэнтне... бы. У брыгадзе поўнасцю зась... ...чышчан насенны фонд, адраман... ...льгасінвентар. На поле вывезе... вазоў гною, вывезена мінераль... ...енне і сабрана 4 цэнтнеры по...

...е месца па калгасу займае брыгада ...ыгі, якая таксама вывезла на ...0 вазоў гною. Усяго па калгасу ...шні дзень вывезены 5 тысяч ва... ...ю, 18 тон мінеральных угнаен... ...сенне па ўсіх 8 брыгадах калга... поўнай гатоўнасці.

...нна рыхтуецца да сяўбы і калгас ...арый». У пятай брыгадзе адра... сельскагаспаларчы інвентар. за... праверан на ўсхожасць насен... і вывезена на калгаснае поле ...оў гною, 150 вазоў торфу, са... 5 пудоў попелу і вывезена са ...8 тон мінеральных угнаенняў. ...змагаецца за атрыманне ў ся... па 30 цэнтнераў аўсу, 23 цэнтне... ...ню з кожнага гектара.

Можна назваць і рад іншых калгасаў раёна, якія паказваюць узоры добрай падрыхтоўкі да сяўбы. Але раённае кіраўніцтва зусім слаба пераносіць вопыт перадавых ва ўсе калгасы. Некаторыя калгасы ўключыліся ў соцспаборніцтва фармальна, а па сутнасці запягваюць падрыхтоўку да сяўбы.

У калгасе «Комунар» не ўсе брыгадзіры, якія ўключыліся ў спаборніцтва, ведаюць, за які ўраджай яны павінны змагацца. Брыгадзір гэтага калгаса Паўлоўскі спакойна заяўляе: «Абавязацельствы бралі, але якія, добра не памятаю». Нязіўна, што ў брыгадзе не выконваецца план вывазкі гною. Не закончаны рамонт інвентару і засыпка насення.

У калгасе імя Калініна вывазка гною не распачата. Старшыня калгаса Рэут спакойна разважае. «Гной вазіць не распачыналі, таму, што блізка ўчасткі зямлі і мы справімся вывезці гной вясной».

Усе гэтыя факты, відаць, мала турбуюць кіраўніцтва Слуцкага раёна. Райза і МТС канкрэтна не кіруюць падрыхтоўкай да сяўбы.

І. ВЕЧАР, І. СЫМОН.

ЗМАГАЕМСЯ ЗА ВЫСОКІ ПРАЦАДЗЕНЬ

Наш калгас «Авангард», Даманавіцкага раёна, у 1937 годзе атрымаў значна большы ўраджай, чым ва ўсе мінулыя годы. Дзякуючы вялікай дапамозе і штодзённым клопатам комуністычнай партыі і асабіста правадыра народаў таварыша Сталіна аб калгасным сялянстве, мы сталі жыць сапраўды заможна і культурна.

У калгасе за мінулы год пабудавана электрастанцыя і многа розных будынкаў.

Зараз усе калгаснікі рыхтуюцца да веснавой сяўбы, каб у 1938 годзе дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю, значна больш узняць кошт працадня. Кожны калгаснік абавязаўся змагацца за сталінскі ўраджай. Паміж брыгадамі, звеннямі і ўсімі калгаснікамі паасобку разгарнулася социялістычнае спаборніцтва за выкананне ўзятых абавязацельстваў.

Да веснавой сяўбы наш калгас поўнасцю засыпаў і ачысціў насенне ўсіх культур, поўнасцю адрамантаваў інвентар, збрую, вывез усе мінеральныя ўгнаенні. Да 28 студзеня было сабрана 3 тоны попелу, загатоўлена і вывезена на поле 90 тон торфу.

Да 15 лютага мы абавязваемся поўнасцю закончыць лесазагатоўкі і вывазку, каб усю цягавую сілу перакінуць на вывазку торфу і гною. Да пачатку сакавіка мы вывезем на поле 300 тон торфу і збяром 12 тон попелу. Дабіемся таго, каб усе коні да веснавой сяўбы выйшлі ў вышэйсярэдняй упітанасці.

Веснавую сяўбу наш калгас правядзе за 6 дзён і высокаякасна, дабіўшы высокага ўраджаю, узніме кошт працадня.

Старшыня калгаса ЯКАВЕНКА, брыгадзіры, звеннявыя і калгаснікі-стахановцы: ШЫНЬКО, ЕЎСТАХАЎ, МАТРУНА КАЗАЧЭЙКА, КАЦЯ ВОЙТАВА, Д. ДРАЗДОВА, ЗОНЯ ОТЧЫК, КАНЁЎ, СТАРАВОЙТАЎ.

ЗРЫВАЮЦЬ РАБОТУ НОВАЙ МТС

16 снежня 1937 года мяне накіравалі ў ліквідаваны соўгас імя Леніна, Горацкага раёна, часова выконваючым абавязкі дырэктара ўпоўарганізаванай МТС. Я павінен быў прыняць маёмасць ад ліквідкома для МТС: будынкі, якія прыгодны для гаражоў, лепшую цягавую сілу і т. д. Аднак, па міласці ліквідкома, лепшыя будынкі, коні, жалеза, кавальскі і сталярны інструмент, нават сані і вупраж былі распраданы направа і налева. Так, напрыклад, калгасу «Зорка 1 Мая» прадана гумно, якое можа служыць добрым гаражом для камбайнаў і складаных малатарань, у іншыя будынкі гэтыя машыны не ўваходзяць і не змяшчаюцца. Гумно пабудавана з старага лесаматэрыялу, 1/4 частка яго глінабітная, шулы зроблены з цэглы і добра зцементаваны, страха цовая. Калі калгас пачне яго зносіць, большая частка лесаматэрыялу пойдзе на дровы. Раённы тэхнік па вышэйпрыведзеных матывах даў сваё заключэнне — пакінуць гумно за МТС.

Але ў райвыканкоме і райкоме КП(б)Б заяўляюць: «Калгас купіў, ён і гаспадар». Хто даў права ліквідкому прадаваць маёмасць соўгаса, якая павінна была без аплаты перайсці МТС? Раённае кіраўніцтва свае памылкі і зараз не жадае выпраўляць. Каштоўнейшыя дзяржаўныя машыны псуюцца і іржавеюць пад адкрытым небам.

Наркамзем БССР таксама ніякай дапамогі не аказвае. У МТС павінна быць 8 аграномаў, два раз'язных механікі, два інструктары па калгасному ўліку, не лічачы дырэкцыі, але іх няма. МТС знаходзіцца далёка ад чыгункі, сродкі перасоўвання адсутнічаюць. З вылучаных 5 коней трое зусім нягодныя для раз'язду, а адзін, як выявілася, аказаўся праданым ліквідкомам калгасу «Зара».

На тэрыторыі МТС знаходзіцца каля 50 рабочых сямей былога соўгаса. Рабочыя асталіся без паліва і без усякай дапамогі. Аднак райвыканком ніякіх мер не прымае.

Калі пасылалі мяне ў МТС, абяцалі дапамагаць. А на справе атрымліваецца зусім інакш. Усё гэта ставіць пад пагрозу зрыву своечасовую падрыхтоўку МТС да веснавой сяўбы.

БАГДАНАЎ,
часова выконваючы абавязкі дырэктара Ленінскай МТС, Горацкага раёна.

ПРАДУГЛЕДЖАНА ЎСЁ—ДА ДРОБЯЗЕЙ

Дружна рыхтуюцца да веснавой сяўбы калгаснікі сельгасарцелі «Большэвік», Кудаеўскага сельсовета, Аршанскага раёна. У калгасе даўно засыпаны, ачышчаны і праверены на ўсхожасць насенныя фонды. У гэтым годзе пасеўная плошча калгаса значна пашыраецца за лік зямель, прырэзаных ад ліквідуемага соўгаса. І гэта ўлічана пры засыпцы насення.

Увесь інвентар у калгасе адрамантаван і прывезен у парадак. У поўнай гатоўнасці стаяць сеялкі, 20 плугоў, 40 барон «зіг-заг», 7 пружынных барон, калёсы, акучнікі і т. д. Адрамантавана і падагнана да коней 40 хамутоў, аброці, лейцы і іншая збруя. Шорнік Сямён Кавецкі прадугледзіў ўсё—да дробязей.

— У гарачы час сяўбы, — кажа ён, — спраўная супонька — лішняя баразёнка...

Дзве паляводчыя брыгады калгаса спаборнічаюць паміж сабой на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. У калгас ужо завезена 28 тон мінеральнага ўгнаення, сабрана 8,6 тон попелу, вывезена 850 вазоў гною. На вывазцы гною такія калгаснікі, як Кухарэнка, Мязвецкі і іншыя сістэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі; замест 7 вазоў па норме, яны вывозяць па 11—12. Загатоўлена таксама 500 тон торфу, які калгаснікі абавязаліся ў бліжэйшы час вывезці на поле.

Зараз калгас заканчвае выкананне плана лесавывазак, пасля чаго коні будуць пастаўлены на адпачынак. Конематкі і маладняк вылучаны ў асобныя групы і за імі наладжан добры догляд.

Д. ПУЛЬЯНАЎ.

„ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ"

(Новы фільм вытворчасці „Ленфільм")

На экране нозы гукавы мастацкі фільм пра гераічнае мінулае нашага народа, пра славу і поспехі нашай горача любімай Чырвонай Арміі. Як і многія іншыя фільмы апошняй вытворчасці, фільм «Валачаеўскія дні» (пастаноўшчыкі рэжысёры-ордэнаносцы браты Васільевы, аўтары «Чапаева») сустрэт нашым гледачом з велізарным задаволеннем, пачуццём гордасці за сваю радзіму, вынесшую на сваіх плячах нямала інтэрвенцкіх, праваканыйных налётаў і захаваўшую ад усіх і ўсякіх пасягацельстваў новы лад, народжаны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыяй.

Ніколі не агладзіцца ў памяці совецкага народа гісторыя легендарных паходаў прыамурскіх партызан, гісторыя выратнага і рашучага разгрому японскай інтэрвенцыі на нашым Далёкім Усходзе. Разгром японскіх інтэрвентаў — гэта выдатная старонка барацьбы нашага народа, нашай большэвіцкай партыі. Яна адлюстравана з выключнай прастатой і падкупаючай прыбавасцю ў фільме «Валачаеўскія дні».



Артыст Н. Дарохін у ролі большэвіка Андрэя.

Фільм пачынаецца паказам высадкі дэсанта японскіх войск у Владзівастоку. Пад выглядам аховы жыцця японскага насельніцтва дэсант пад камандаваннем палкоўніка Усіжыма (арт. Свердлін) размяшчаецца ў горадзе і пачынае тварыць праваканыйныя спразы. Забойства па заданню Усіжыма рукамі рускага белагвардзейца майстра галізнікаў японца, зробленае з праваканыйнай мэтай, выклікае ў нашага гледача пачуццё агіды і ганьбы да японскіх захопнікаў, якія не менш цынічны і наглы і зараз у сваіх дзеяннях з кітайскім народам, падняволенням якога так прагне лютая японская кліка ваенна-фашысцкіх дзяльцоў.

Шляхам розных праваканый японскі перадавы атрад прабіраецца ў глыбіню края. Над мірным і нявінным насельніцтвам ён чыніць беспадобныя эзярныя здзекі, паліць на сваім шляху вёскі, прагне тэрыторыі аж да Байкала.

Не маглі няпрошаныя госці карыстацца павагай. Народная нянавісць да захопнікаў расла не па днях, а па гадзінах, яна клікала на рашучую барацьбу з ворагам, яна патрабавала арганізаванасці. І большэвіцкі камітэт Владзівастока пасылае ў таежныя сёлы большэвіка Андрэя (арт. Дарохін) для арганізацыі партызанскіх атрадаў. Мапа — дачка машыніста (у гэтым вобразе ўвасоблены дзесяткі, сотні жанчын-гераінь) в выключным майстэрствам і, пры гэтым, захапляючым кампізмам правозіць Андрэя праз белагвардзейскія заставы да партызанскіх сіл, яшчэ раздробленых, не арганізаваных. Паказана ў фільме, як па закліку нашай большэвіцкай партыі, пад кіраўніцтвам яе лепшых прадстаўнікоў (выдатны вобраз Андрэя) з усіх вёсак сцякаюцца таежныя партызаны, стварэючы грозную сілу ў барацьбе з ворагам.

Гэта адчуў японскі палкоўнік Усіжыма з першых крокаў дзейнасці партызанскага атрада пад кіраўніцтвам большэвіка Андрэя. Партызаны ўносілі яўны разлад у ажыццяўленне каварных планаў інтэрвентаў. Яны ўзрывалі масты, абрывалі сувязь, а часта нечаканым рэйдам бязлітасна знішчалі асобныя японскія атрады. У фільме ёсць рад выдатна, майстэрска зробленых эпізодаў сутычак, калі гледач, совецкі патрыёт бурна апладыруе партызанам, весела смяецца над панамі—японцамі.

Цікавы момант у фільме — паказ сустрэчы палкоўніка з камандзірам партызанскага атрада. Каб выйграць час і сцягнуць для рашучага ўдару свае атрады, Усіжыма прапанаваў партызанскаму камандванню заключыць перамір'е. Каб дачакацца прыходу чырвонаармейскіх часцей перамір'е неабходна было і для партызан. І Андрэй едзе ў штаб палкоўніка для перагавораў. Пад страхам смерці палкоўнік паімкнуўся прымусіць Андрэя падпісаць кабальныя ўмовы. Але і Андрэй, прыадчыніўшы фіранку акна, паказаў палкоўніку, што страшыць і яму ёсць чым. Штаб быў акружан партызанамі...

Фільм інтрыгуе гледача. Ён прымушае яго чакаць нечага радаснага, усёперамагаючага, урачыстага. Гэтым чаканым момантам і з'яўляецца ў фільме прыход часцей любімай Чырвонай Арміі. Праз глыбокія снягі і лясныя гушчары, праз дротавыя агарожы і глыбокія акопы сакрушальнай лавінай рынуліся сілы Чырвонай Арміі і партызан для рашучага наступлення. Пры цёмнай ночы гледач заўважае, як у баі японскія інтэрвенты ганебна церпяць паражэнне. Смелым народным наступам змятаюцца японскія часці, астаткі якіх прымушаны ганебна ўцякаць. Цяпер прыняты былі ўмовы нашага камандавання: праз 24 гадзіны пакінуць тэрыторыю Далёкага Ўсхода.

Поезд з японскімі салдатамі і палкоўнікам Усіжыма адыходзіць за-сваясі. Мяцёлка, падвязаная рабочымі да задняга вагона, падмятала след. Бяссільныя перад магутным рэволюцыйным народам японскія інтэрвенты з ганьбай беглі з нашага Далёкага Ўсхода.

З магутнай і непаўторнай сілай зырастае з грудзей пераможцаў знаёмая і прыгожая песня:

И останутся как в сказке,
Как манящие огни,
Штурмовые ночи Спасска,
Волочаевские дни...

Фільм выхоўвае ў нашага гледача выдатныя якасці совецкага патрыятызма. Ён натхняе на новыя гераічныя справы. Гераічнае цудоўнае, што было ўчора, выклікае ў кожнага грамадзяніна СССР гонар за сваю радзіму, за сваю партыю большэвікоў, любоў да горача любімай доблеснай Чырвонай Арміі.

«Валачаеўскія дні» — добры падарунак ад совецкай кінематаграфіі да слаўнага XX-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

П. КАВАЛЁЎ.

З Тбіліскай выстаўкі жывапісі, скульптуры і графікі на тэму: «Да гісторыі большэвіцкіх арганізацый Грузіі і Закаўказзя». **На здымку:** карціна мастака А. Кутацеладзе «Гутарка таварыша Сталіна з сялянамі Аджарыі».

ДОМ № 10

...я.

...я чатырох гадзін язды ад Тбілісі ...обіць дзесяцімінутную астаноўку. ...а Горы.

...з акна вагона відна старадаўняя ...ь Горыс-Ціхе*). Яна пабудавана ...стагоддзі нашай эры пры візан... імператару Іракле.

...а да вакзальнай плошчы падступ... суровыя горы.

— у гарыйскай даліне Каўказа, ...ваюцца воды Куры, Ліахвы і Цхін... Археолагі ўстанавілі, што людзі ...ут яшчэ дзве — дзве з паловай ...і год таму назад.

...гэту далину праходзіла пабуда... рымлянамі плітачная дарога з ...і ў Азію, рэшткі якой можна ба... яшчэ і зараз. Тут па паданнях бы... ...імае месца палявання царыцы Та... Яшчэ і цяпер вам пра яе раска... ...тут шмат прыгожых рамантычных

...горад Горы пабудаван у XII ста... ...пры грузінскім цару Давідзе.

...XII стагоддзі горад быў разгромлен ...-Ханам. Пабывалі тут і полчышчы ...гана. 250 год Горы быў пад іран... ...уладарствам. У 1599 годзе горад ...маў дзевяцімесячную асаду стаўле... ...грана, пара Сімона І-га, які пасля ...я горала часткова зруйнаваў Го... ...іхе.

...XVIII стагоддзі горад быў цэнтрам ...скіх хваляванняў, якія стыхійна ...валі супроць нечалавечага ўціску ...іх управіцеляў і, у прыватнасці, су... ...алнаго з найбольш жорсткіх сярод ...ір-Ахур-Амілахары.

...свія заваявальнікі ўпершыню з'яві... ...ў Горы ў 1768 годзе. Гэта быў атрад генерала Тотлебена. У 1798 годзе ў Горы ўвайшоў 17-ы егерскі полк, пад камандай царскага сатрапа Лазарава, але толькі з 25 мая 1802 года ў гарыйскай даліне была заціверджана ўлада расійскіх цароў.

Гераічная барацьба Шаміля з рускім самадзяржаўем таксама пакінула ў Горы рад помнікаў і дакументаў.

У гэтым гарадку, дзе шум парожыстай, бурлівай Куры змешваецца зараз з гоманам калгаснага базара, з гулкамі паравозаў і аўтамабіляў, ад кожнага камня дыша сівой гісторыяй, кожная пядзь зямлі тут можа расказаць аб вялікіх і грозных баях народаў. Сівыя вяршыні гор — маўклівыя сведкі гэтых баёў, сведкі чалавечых трагедый, гора і радасцей. І сёння, як многа вякоў назад, горы блішчаць на сонцы вечна белымі снежнымі вяршынямі, захоўваючы падзаніі аб мінулым.

Але не гэтыя паданні ператварылі маленькі Горы ў горад, назва якога з любоўю вымаўляецца мільёнамі прапоўных. Ёсць у Горы Краснагорская вуліца. Яна знаходзіцца амаль на ўскраіне, непадалёка ад Усходняга рынка. На гэтай вуліцы, якую зараз вам укажа кожны піонер, стаіць маленькі дамік са скромнай лічбай «10» на фасадзе.

Да сцяны гэтага дамка прыбіта невялікая мрамарная дошка.

Тут нарадзіўся 21 снежня 1879 года і правёў свае дзяцінства да 1883 года
ВЯЛІКІ СТАЛІН.

Усё.

Так мала і ў той-жа час так невымаральна многа гаворыць гэтыя словы.

Мы прыехалі ў Горы вялікай групай. Мы гаварылі на розных мовах. Мы з'ехаліся з самых рознастайных куткоў неасяжнага Совецкага Саюза, з гераічнай Іспаніі, з далёкай Ісландыі. Сярод нас былі і 70-гадовыя старыкі і 20-гадовыя юнакі. Мы былі людзьмі з рознымі прывычкамі і звычаямі, але ўсе мы на хвіліну, без угавору, спыніліся перад порогам гэтага дамка, прарваўшы разгаворы, пачатыя ў дарозе.

Мы ўглядаліся ў пачарнелы парог дома, праз які ўпершыню пераступіў і вышаў у свет, вышаў яшчэ падтрымліваемы маці, яшчэ робячы першыя, няўпэўненыя крокі, маленькі Сосо.

Мы стаялі ля гнязда, з якога вылецеў горны арол рэволюцыі.

У адным з двух пакояў, з якіх складаецца дамік, ператвораны цяпер у невялікі музей, захаваліся рэчы сям'і Джугашвілі. Гэта драўляны ложак, пакрыты шарсцянай даматканай накідкай (той самы ложак, на якім нарадзіўся Іосіф Вісарыёнавіч), маленькае круглае люстэрка ў драўлянай раме, табурэтка, жбаночак для віна.

У другім пакоі сабраны кароткія даныя аб бацьках таварыша Сталіна і аб ім самім.

Вось партрэт гаранкі, ужо не малады, з адкрытым строгім тварам.

Гэта яна, арліца горнай далины Каўказа, дала свету Сталіна.

«Екацерына Георгіеўна Джугашвілі. Нарадзілася ў сяле Гамбарэулі ў 1856 годзе.

Памерла ў 1937 годзе ў гор. Тбілісі».

— гаворыць надпіс.

«Вісарыён Іванавіч Джугашвілі Нарадзіўся ў сяле Дзідзі-Ліло ў 1850 годзе.

Памёр у 1906 годзе ў гор. Тбілісі» — батька правадыра. Шавец па прафесіі, наняты прадпрыемцам Барамавым у Тбілісі і прывезены ім у Горы.

На процілеглай сцяне фота хлопчыка з шырока раскрытымі, крыху здзіўленымі вачыма. Гэта самы малодшы сын Вісарыёна Джугашвілі (двое старэйшых — Міхаіл і Георгій памерлі) «Іосіф Вісарыёнавіч Сталін — вучань гарыйскага духоўнага вучылішча, 1893 год».

Тут-жа ніжэй фотакопія метрычнай кнігі Гарыйскага успенскага сабора с запісам аб нараджэнні Іосіфа Вісарыёнавіча Джугашвілі — «9/21 снежня 1879 года».

Ля дамка зараз рукамі гарыйцаў любоўна разбіт кветнік, зроблен фантан. Над самім дамкам пабудавана шкляное прыкрыццё, умацаванае на мрамарных калонах. Побач — будынак, у якім размешчан філіял гістарычнага і этнаграфічнага музея Грузіі. Але сам дом захаван у сваім першапачатковым выглядзе, і як гэта цудоўна!

Мы з хваляваннем апускаліся па сталітаных ступенях, абыходзілі вакол гэтага вельмі простага будынка і мысліі мімаволі ўносіліся далёка, далёка на Поўнач, за снегавыя хрыбты Каўказа да зубчатых сцен Крэмля, над башнямі якога гарыць рубінавыя зоры перамогі. Мыслі ўносіліся за гэтыя сцены да яго, да самага дарагога, самага блізкага, самага роднага сярод людзей і, адсюль, ад яго калыскі, кожнаму з нас хацелася сказаць асаблівымі, непадобнымі на звычайныя, словамі аб пачуццях, якія нарадзіліся ў душы.

Сярод нас знаходзіўся азербайджанскі ашуг Мірза. Ён нервова развязаў чахол свайго васьміструннага саза, устрахнуў галавой і запеў высокім, амаль жаночым голасам. Саз меладычна ўторыў песні ашуга. Яго цела рытмічна пагойдвалася, а гукі песні ўносіліся да гор.

Я запытаў, аб чым ён спявае,
...У меня есть горячее сердце,
У меня есть прекрасная песня,
У меня есть пламенная душа ашуга.
И сердце, и душу, и песню,
Если нужно, возьми, моя родина.
И сердце, и душу, и песню
Я отдаю тебе Сталин...
Я отдаю тебе все, что имею,
А имею я очень много...
...перакладзі мне.
Ашуг прадаўжаў спяваць.

Мітынг пачаўся не таму, што яго загадзя рыхтавалі. Калі-б раней аб ім і не думалі, ён усёроўна адбыўся-б. Кожны адчуваў неабходнасць аформіць у словы і перадаць таварышу тое, што напаўняла яго да краёў.

Такія мітынгі бываюць рэдка. Часта яны і не могуць быць. Калі таксама без угавору, на многіх мовах мы ўсе запелі «Інтэрнацыянал», ён гучэў іменна так, як павінен гучэць гэты гімн.

Калі селі ў вагоны, гаварыць не хацелася. Поезд крануўся. Падышлі да вокнаў, каб яшчэ раз зірнуць на пакрыты вячэрнім змрокам Горы.

Ашуг Мірза, шагойдваючы пеламі у такт поезда, ціхенька напяваў нейкую імправізацыю.

Яго папрасілі спець песню, якую ён пеў «там».

Ён запеў.

Мы моўчкі слухалі гартанную песню ашуга і думалі, кожны па-свойму, але ўсе аб адным і тым-жа — аб Сталіну.

Рытмічна гучэлі калёсы. Над горам спускалася ноч.

Насустрач поезду несліся асляпляючыя агні Затеса, агні новага, цудоўнага социялістычнага «сёння».

Ів. ШАПАВАЛАЎ.

Гарыйская крэпасць.

У ЛОНДАНСКІМ КАМІТЭЦЕ ПА НЕЎМЯШАННЮ

ЛОНДАН, 4 лютага. (БЕЛТА). Як вядома, палітычная атмасфера Англіі і Францыі моцна ўзбударажана нядаўнім патапленнем у іспанскіх водах брытанскага судна «Эндыміён», на якім у ліку іншых загінуў кантралёр камітэта па неўмяшанню швед Ларсен; патапленнем, зробленым па ўсіх правілах пірацкага майстэрства падводнай лодкай «невядомай нацыянальнасці». Не гледзячы на гэта, старшыня камітэта Плімут не ўключыў у павестку дня сёнешняга пасяджэння падкамісіі пры старшыні камітэта па неўмяшанню пытанне аб гэтым новым злачынстве генерала Франко і яго замежных апекуноў.

Падкамісія падвергла папярэднему абмеркаванню праект фінансавання эвакуацыі «валанцёраў», калі такая эвакуацыя з галіны слоў пяройдзе ў галіну канкрэтных фактаў. Абмеркаванне звялося да пералівання з пустога ў парожняе, да выкладання розных «мысляў» асобных членаў падкамісіі аб скарачэнні агульнай лічбы эвакуацыйных выдаткаў. І тут не зусім нечакана ўсплылі некаторыя затоеныя жаданні фашысцкіх дзяржаў.

На адным з папярэдніх пасяджэнняў падкамісіі, калі сакратарыяту апошняй было даручана скласці план эвакуацыі «добраахвотнікаў», прадстаўнік СССР тав. Майскі патрабаваў, каб эвакуацыя «валанцёраў» праводзілася не наогул, а па катэгорыях. Так, калі было-б устаноўлена, што да пэўнага чысла павінна быць выведзена 20 проц. усіх «валанцёраў», то гэта азначала-б, што эвакуацыі належыць не проста 20 проц. усёй колькасці «валанцёраў» наогул, а 20 проц. пяхоты, 20 проц. артылерыі, 20 проц. авіяцыі і т. д. Такая перасцярога важна таму, што фашысцкія дзяржавы, вядома, будуць імкнуцца запоўніць належачую эвакуацыі «квоту» менш каштоўнымі з ваеннага пункту гледжання часцямі, захоўваючы ў той-жа час да самага апошняга моманту ў поўнай сіле асабліва важныя ў сучаснай вайне тэхнічныя часці (авіяцыя, танкі, артылерыя і т. д.).

Патрабаванне тав. Майскага было падтрымана прадстаўнікамі Англіі і Францыі, а прадстаўнікі Германіі і Італіі не адважыліся супроць яго пярэчыць. У выніку к вялікаму незадаволенню фашысцкіх прадстаўнікоў, вывад «валанцёраў» па катэгорыях быў прынят у агульным плане эвакуацыі. Сёння пры абмеркаванні матчымай эканоміі і пры рэалізацыі гэтага плана, германскі прадстаўнік Верман прапанаваў «у інтарэсах захавання выдаткаў» адмяніць катэгорыі і рабіць эвакуацыю ўсіх «валанцёраў» наогул.

Тав. Майскі рашуча выступіў супроць прапановы германскага прадстаўніка, і яна была адвергнута.

У канцы пасяджэння тав. Майскі выразіў здзіўленне па поваду таго, што падкамісія не палічыла патрэбным заявіць пратэст, або хоць-бы глыбокі жаль у сувязі з смерцю кантралёра камітэта Ларсена, загінуўшага пры выкананні службовых абавязкаў.

Пасля выступлення тав. Майскага лорд Плімут заявіў, што перад адкрыццём пасяджэння ён у прыватным парадку выказаў жаль з поваду пагібелі Ларсена шведскаму прадстаўніку ў падкамісіі. Тав. Майскі заявіў, аднак, што ён настойвае на выражэнні жалю па поваду пагібелі Ларсена ад імя ўсёй падкамісіі. Гэта прапанова ў выніку была ўнесена ў камюніке пасяджэння.

Да ваенных дзеянняў у Кітаі. **На здымку:** эвакуацыя жыхароў Нанкіна перад захопам горада японскімі інтэрвентамі. (СФ).

НАДВОР'Е У ГРЭНЛАНДСКІМ МОРЫ

Па даных Цэнтральнага інстытута надвор'я, у раёне Міг-Бухты на ўсходнім беразе Грэнландыі ў 7 гадзін 4 лютага дуў паўночна-заходні вецер сілай у 5 балаў. Тэмпература паветра—мінус 10 градусаў, вялікі снегапад, поўная воблачнасць.

Пяцібальны вецер у Міг-Бухце трымаўся ўвесь дзень 4 лютага. Тэмпература паветра ў 13 гадзін павысілася да мінус 9 градусаў (напярэдадні днём тэмпература паветра была мінус 20 градусаў) ... пад не паслабяваў.

На востраве Ян-Майен у 7 гад... цы 4 лютага дуў чатырохбальны... была поўная воблачнасць, тэмпера... ветра—мінус 8 градусаў. У 13 ... 4 лютага вецер дуў з той-жа сілай ... ратура паветра павысілася да мінус ... дусаў.

Няма падстаў меркаваць, што ... Грэнландскага мора ў бліжэйшы ч... развіцца новы шторм. (БЕ...).

СУСТРЭЧА ДЭПУТАТАЎ З ПІОНЕРАМІ І ШКОЛЬНІКАМІ М...

Больш 400 піонераў і школьнікаў сабраліся 5 лютага ў менскі Палац піонераў на сустрэчу з дэпутатамі Вярхоўнага Совета тт. Кавалёвым, Ванеевым і Жабравым. Цёпла сустрэтыя шчаслівай дзевятарой дэпутаты занялі месцы ў прэзідыуме разам з лепшымі выдатнікамі вучобы.

Адкрываючы сход, піонерка Косарава Ніна папрасіла дэпутатаў расказаць аб выдатнай рабоце першай Сесіі Вярхоўнага Совета, аб прынятых Сесіяй рашэннях і пастановах.

З прамовай выступіў дэпутат В... га Совета старшыня СНК БССР ... валёў. Ён расказаў дзецям аб ... днях работы першай Сесіі ... парламента. Расказ тав. Кавалёва ... стрэчы з любімым бацькам і наст... дарагім і мудрым таварышам С... і яго слаўнымі саратнікамі выклі... ныя авацыі прысутнічаўшых.

Сустрэча закончылася вялікім ... мастацкай самадзейнасці гурткоў п...

ПРАТЭСТ УРАДА СССР ПА ПОВАДУ НЕЗАКОННЫХ ДЗЕЯННЯЎ ІТАЛЬЯНСКІХ СУДОВЫХ УЛАД

20 студзеня гэтага года міланскі трыбунал вынес рашэнне аб накладанні арышту на маемасць СССР, якая знаходзіцца ў міланскім аддзяленні «Банко дзі Рома», ў парадку папярэдняга забеспячэння іска італьянскай фірмы «Ансальдо» да гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Італіі.

Як упамянутае патрабаванне фірмы «Ансальдо», заведама неабгрунтаванае, так і рашэнне трыбунала, якое прама парушае гандлёвы дагавор, заключаны паміж СССР і Італіяй 7 лютага 1924 года, прадстаўляюць сабой далейшае развіццё самавольных і беззаконных дзеянняў італьянскіх устаноў і фірм, адмовіўшыхся выконваць свае абавязацельствы ў адносінах да совецкіх гаспадарчых арганізацый, а зараз прабуючых ужо накласці руку на маемасць СССР у Італіі.

Урад СССР даручыў паўпрэдству СССР у Італіі заявіць італьянскаму ўраду рашучы пратэст па поваду незаконных дзеянняў міланскіх судовых улад і патрабаваць адмены гэтых дзеянняў, парушаючых совецка-італьянскі гандлёвы дагавор і палажэнні міжнароднага права, з ускладаннем на італьянскі ўрад адказнасці за шкоду, нанесеную Совецкаму Саюзу азначаным беззаконнем.

(БЕЛТА).

КУРС НА НОВЫЯ ВАЕННЫЯ АВАНТУРЫ

БУЙНЫЯ ЗМЕНЫ Ў ГЕРМАНСКІМ УРАДЗЕ

БЕРЛІН, 5 лютага. (БЕЛТА). Ва ўсіх газетах апублікаваны распараджэнні Гітлера аб буйных зменах у германскім ўрадзе і рэарганізацыі ваеннага міністэрства, міністэрства гаспаладаркі і міністэрства замежных спраў. Усё кіраўніцтва ваеннымі, палітычнымі і гаспадарчымі пытаннямі Гітлер канцэнтруе ў сваіх руках. Кіраўніцтва ўсімі ўзброенымі сіламі Германіі Гітлер прымае на сябе. Ваеннае міністэрства рэарганізуецца. Знаходзіўшаеся да гэтага часу ў сістэме ваеннага міністэрства ўпраўленне ўзброеных сіл рэарганізуецца ў «вярхоўнае камандаванне ўзброеных сіл», якое непасрэдна знаходзіцца пад кіраўніцтвам Гітлера ў якасці яго «ваеннага штаба».

Кіраўніком «вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл» назначан генерал Кейтэль. Былы ваенны міністр генерал фельдмаршал Бломберг, а таксама галоўнакамандуючы арміяй генерал Фрыч пайшлі ў адстаўку. У афіцыяльным паведамленні іх адстаўка матывуецца «слабым здароўем». Каманду ючым арміяй замест Фрыча назначан генерал ад артылерыі Браўхіч, які адначасова атрымаў чын генерал-палкоўніка. Адначасова апублікован вялікі спіс перамяшчэнняў і назначэнняў у камандным складзе арміі і ваенна-паветраных сіл, а таксама звольненых у запас асоб вышэйшага каманднага складу.

Герынг, які знаходзіцца ў чыне генерал-палкоўніка, атрымаў чын генерал-фельдмаршала.

У міністэрстве замежных спраў таксама праведзены буйныя змены. Міністр замежных спраў Нейрат зволен у адстаўку. Замест яго міністрам замежных спраў назначан Рыбентроп. Адначасова для кіраўніцтва пытаннямі замежнай палітыкі створан «тайны совет». Старшынёй тайнага совета назначан Нейрат. Членамі совета назначаны: Рыбентроп, Герынг, Гес, Гебельс, Браўхіч, адмірал Рэдэр і генерал Кейтэль.

Распараджэннем Гітлера адкліканцца са сваіх пастоў германскія паслы: у Рыме — Гасель, у Токіо — Дырксен і пасол у Вене — Папен.

Назначаны міністрам гаспаладаркі былы статс-сакратар міністэрства прапаганды Функ уступае ў выкананне абавязкаў міністра.

Газеты паведамляюць, што на 20 лютага назначана «пасяджэнне» рэйхстага, на якім будзе агалошана дэкларацыя ўрада.

***

ПАРЫЖ, 5 лютага. (БЕЛТА). Французскія палітычныя колы, якія з найвялікшай увагай сачылі за развіццём унутранага палітычнага крызісу гітлераўскай Германіі, сустрэлі з несумненнай трывогай змены і перамяшчэнні ў ваенным і дыпламатычным апараце Германіі.

Перамяшчэнні, праведзеныя Гітлерам, расцэньваюцца, як цяжкае паражэнне рэйхсвера, як перамога прыхільнікаў паскоранай падрыхтоўкі і развязвання еўрапейскай вайны. Думаюць, што гэтыя змены ў Германіі ўзмоцняць напружанасць у міжнародным становішчы.

Знешнепалітычны аглядальнік газеты «Пці парызьен» Бургес заяўляе, «Асноўным фактам з'яўляецца тое, што зараз адбываецца надзвычайная канцэнтрацыя ўсёй улады ў руках Гітлера. З пункту погляду ўнутранай германскай палітыкі гэтыя змены, быць можа, выкліканы неабходнасцю знішчыць узаемнае суперніцтва некаторых асоб. З пункту погляду замежнай палітыкі яны азначаюць узмацненне ўзбраенняў і правядзенне мер, якія не сведчаць аб міралюбівых пачуццях. Прыход Рыбентропа на пост міністра замежных спраў пацвярджае гэта ўражанне».

Па словах Пертынакса ў «Эко дэ Пары», Гітлер рашыў мабілізаваць усё для падрыхтоўкі вайны.

НОТА ЯПОНІІ АБ ЭВАКУАЦЫІ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН

ШАНХАЙ, 4 лютага. (БЕЛТА). Днямі японскае пасольства ў Бейпіне адправіла ноту замежным консулам, прапануючы замежным грамадзянам эвакуіравацца з Цэнтральнага Кітая.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Як паведамляе агенцтва Гавас, рэспубліканцы 3 лютага адваявалі ў мяцежнікаў пазіцыі Сальто дэль Гамо, у сектары Пеньяроя, на захад ад Пасабланка. Прасоўванне рэспубліканскіх войск было падтрымана артылерыйскім агнём, сканцэнтраваным па ўмацаваннях мяцежнікаў і на іх тылавых шляхах зносін. У часе боя рэспубліканскія знішчальнікі прымусілі ўцякаць двухматорныя самалёты мяцежнікаў. Рэспубліканцы захапілі палонных і значную колькасць ваенных матэрыялаў. Контратакі мяцежнікаў, прадпрынятыя імі 4 лютага, былі адбіты рэспубліканцамі.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Па паведамленню рэспубліканскага міністэрства абароны, раніцою 4 лютага тры фашысцкіх самалёты, з'явіўшыя з боку мора, скінулі 20 бомб на паўднёвую частку г. Тарагоны. У рэзультаце фашысцкага налёту забіт адзін чалавек. Днём 4 лютага да Тарагоны прабавалі наблізіцца з поўдня яшчэ 8 фашысцкіх самалётаў, але яны былі адагнаны агнём зенітных батарэй.

КЛАСАВАЯ БАРАЦЬБА ЗА РУБЯЖОМ

Рост стачачнага руху ў Англіі

ПАРЫЖ, 4 лютага. (БЕЛТА). «Бюлетэнь катыд'ен» прыводзіць наступныя даныя, якія характарызуюць стачачны рух у Англіі.

За 1937 год у Англіі і Паўночнай Ірландыі мелі месца 1.122 забастоўкі—на 304 больш чым у 1936 годзе. У забастоўках прымалі ўдзел 608 тысяч рабочых супроць 322 тысяч, прымаўшых удзел у стачках у 1936 годзе.

Асабліва ўэрос, у параўнанні з 1936 годам, стачачны рух у вугальнай прамысловасці, дзе ў 1937 годзе баставала звыш 390 тысяч рабочых супроць 181 тыс. у 1936 годзе. Значна ўэрос, у параўнанні з мінулым годам, лік забастобак будаўнічых рабочых, у якіх прымалі ўдзел 91 тыс. супроць 29 тысяч баставаўшых у 1936 годзе.

Сярод забастовак заслугоўваюць быць азначанымі—стачка ў Клайдэ, якая працягвалася звыш 2-х месяцаў і ў якой прымала ўдзел звыш 10 тыс. рабочых, вераснёўскія забастоўкі ў Ланкашыры і Іоркшыры, ахапіўшыя да 14 тыс. рабочых, і забастоўка докераў у Гуле з 7 тысячамі ўдзельнікаў.

Як па колькасці забастовак, так і па колькасці прымаўшых удзел у іх рабочых 1937 год пераўзыходзіць усе папярэднія годы, пачынаючы з 1924 года. Выключэнне складае толькі 1926 год, калі ў Англіі адбылася ўсеагульная забастоўка.

ГАЛЕЧА Ў ПОЛЬСКАЙ ВЁСЦЫ

ВАРШАВА, 4 лютага. (БЕЛТА). Газета «Кур'ер поранны» змяшчае артыкул, у якім апісваецца жыццё раду вёсак у Варшаўскім прыгарадным раёне. Палкрэслівшы, што гутарка ідзе не аб ускраінах Польшчы, а аб вёсках, размешчаных блізка ад сталіцы Польшчы, газета піша:

«Жыццё ў воласці Забаруў (23 км. ад Варшавы) робіць уражанне надзвычайнага гаспадарчага, маральнага і разумовага ўбоства. У гэтых умовах і ў атмасферы безнадзейнасці сяляне, спіснуўшы кулакі і зубы, прыслухваюцца да рэвалюцыйнай агітацыі. У іншых волаццях — тая-ж карціна. Усюды — галеча, адсутнасць элементарнай культуры і асветы».

У ФАШЫСЦКАЙ ІТАЛІІ

Заправілы фашысцкай Італіі (таксама як і Трэцяй імперыі) уладаюць вельмі своеасаблівымі ўласцівасцямі. Чым горш у іх справы ўнутры краіны, тым больш яны ляскаюць зброяй. Ніколі яшчэ з старонак італьянскіх газет не сышалася столькі пагроз па адрасу другіх дзяржаў, колькі цяпер. Немалую ролю ў гэтай справе адыгрывае праслаўтая «ось» Берлін — Рым — Токіо.

Нельга сказаць, каб фашысцкія краіны толькі пагражалі па адрасу другіх краін. Карыстаючыся «асобымі» да сябе адносінамі з боку Англіі і Францыі, яны бесперапынна расшыраюць інтэрвенцыю ў Іспаніі і Кітаі. Яны ўзбройваюцца шалёнымі тэмпамі.

Фашысцкая Італія са скуры лезе, каб раўняцца па сваіх саюзніках. Уся гаспадарка краіны падпарадкавана інтарэсам вайны.

Краіна даведзена літаральна да жабрацтва ў імя шалёных мілітарыстычных планаў.

Ужо вайна ў Абісініі, якая каштавала дванаццаць мільярдаў лір (па перапаменшаных афіцыйных даных), у корані падарвала і без таго хісткую гаспадарку краіны. Але вайна ў Абісініі не закончана. Яна прадаўжаецца. Абісінія не заваявана, яна толькі акупіравана, піша базельская газета «Нацыяналь цэйтунг». Італьянскія войскі з'яўляюцца гаспадарамі гаралоў і іх бліжэйшых ваколіц. Уся астатняя частка Абісініі знаходзіцца пад уплывам італьянцаў. Усюды дзейнічаюць буйныя партызанскія атрады. Фашысты вымушаны, піша газета, бесперапынна пасылаць у Абісінію ўсё новыя і новыя войскі. У краіне панае голад, бо абісінцы не хочуць сеяць, ведаючы, што ўраджай будзе адабраны акупантамі.

Наколькі вялікія яшчэ да гэтага часу выдаткі, звязаныя з абісінскай авантурай, відаць хоць-бы з таго, што італьянскі ўрад абвясціў, што з сакавіка 1938 года будзе ўведзен новы надзвычайны падатак для пакрыцця выдаткаў «па асваенню Абісініі».

Няма ўжо такога віду падаткаў, якога-б не прыдумалі фашысцкія ўлады. Народ літаральна стогне пад цяжарам аброкаў і паборaў. За час уладарства фашыстаў зарплата італьянскіх рабочых знізілася амаль на 50 проц. Дрэннае харчаванне прыводзіць да таго, што смяротнасць расце з кожным годам пры адначасовым падзенні нараджальнасці. Рабочыя тулянца цэлымі сем'ямі ў брудных жалтых халупах, пазбаўленых святла, і за гэта яны павінны плаціць каля паловы свайго нікчэмнага заработку. Чатырыста лір (каля 120 руб.) — гэта месячны заработак кваліфікаванага рабочага з вялікім стажам. Заработак жанчыны-работніцы складае 90—100 лір (25—30 рублёў) у месяц за 10—12 гадзін працы.

Каб меркавацць аб мізэрнасці гэтага заработку, даволі сказаць, што кілограм хлеба каштуе каля 2 лір. Пры гэтым у краіне адсутнічае страхаванне рабочых ад хваробы, ад інвалідасці. З-за бязрні пазбавіцца работы работніцы нярэдка не пакідаюць станка да самага дня родаў.

У жуласных умовах жывуць сяляне. Вось як апісваюць аўтары кнігі «Сіцылійскія сяляне» жыццё вясковай беднэты: «Гэтыя няшчасныя працуюць увесь дзень пад пякучымі праменнямі палячага сонца. Ноччу-ж яны спяць пад адкрытым небам...

Пасля такога жыцця, нават на працягу кароткага часу, многія нясуць далому зародкі цяжкіх хвароб, якія робяць іх непрацаздольнымі і хутка зводзяць у магілу. Усё гэта выклікаецца жаданнем селяніна-беднякa зарабіць на працягу 1—2-х тыдняў некалькі лір».

Фашысцкія аўтары пытываванай кнігі «Сіцылійскія сяляне» вымушаны прызнаць, што сяляне вядуць жабрацкае існаванне, што мясную страву яны могуць паспытаць толькі тады, калі па дзяпоўцы ўдаецца купіць мяса ад загінуўшай жывёліны.

Антыфашысцкі журнал «Стато операйо» пісаў аб жыцці вясковай беднаты і батракоў правінцыі Апулія, што сярэдні дзённы заработак на сям'ю з 4-х чалавек складае адну ліру. «Умовы жыцця гэтых людзей зусім неўяўляемы, — пісаў гэты журнал, — гэта маса людзей, у тым ліку жанчыны і дзеці, пакутуюць ад жахлівых мук голаду. Гарачая ежа гатуецца толькі некалькі разоў у месяц. Кавалачак хлеба з цыбуляй—вышэйшае шчасце».

Але збяднение краіны, галаданне народных мас не спыняюць Мусаліні і яго паплечнікаў ад новых затрат на ўзбраенні.

Каля паўтара мільёна чалавек знаходзіцца ў сучасны момант пад ружжом, у тым ліку каля 400 тысяч у Абісініі і Іспаніі. І гэта ў краіне, насельніцтва якой складае ўсяго 42 мільёны. У сярэдзіне студзеня італьянскія фашысцкія ўлады абвясцілі аб намеры павялічыць свой ваенны флот. У праграму новага суднабудаўніцтва ўключаны два лінкоры-гіганты водазмяшчэннем у 35.000 тон кожны.

Інтэрвенцыя ў Іспаніі патрабуе велізных выдаткаў. А між тым італьянскія фінансы знаходзяцца ў катастрафічным становішчы. Апублікаваныя гэтымі днямі лічбы гавораць зб тым, што прайшоўшы 1937 год закончыўся з небывалым дэфіцытам, які перавышае 5,2 мільярда лір. Залаты запас амаль вычарпан. Для пакрыцця ўсёкія растучых выдаткаў алішкуюцца ўсякія шляхі. Апрача надзвычайнага падатку, які, як ужо сказана вышэй, будзе ўведзен у сакавіку, фашысцкія заправілы павялічылі абкладанне сялян. Павышаюцца таксама цэны на ўсе прадукты. У першую чаргу павышаюцца цэны на тэкстыльныя тавары, у сярэднім па 25 проц. Усё гэта кладзецца цяжарам на працоўных.

Другі біч працоўных — беспрацоўе. Не гледзячы на ліхарадачную работу ваенных заводаў, беспрацоўе велізарнае. Больш мільёна чалавек зусім пазбаўлены работы. Значная частка рабочых працуе нямоўны тыдзень. У сувязі з жудасным беспрацоўем сярод асоб з вышэйшай асветай фашысцкі друк патрабуе максімальнага зніжэння колькасці студэнтаў у вышэйшых навучальных установах.

Вось што прапануе журнал «Італія медзіка»: «Неаджладна скарацінь колькасць вучняў у сярэдніх школах. Універсітэцкую асвету трэба зрабіць здабыткам толькі выбраных. Трэба дзейнічаць з усёй рашучасцю».

Дзесяткі тысяч маладых людзей з вышэйшай асветай голамі не могуць знайсці сабе хоць якую-небудзь работу. Незадаволенне фашысцкім рэжымам, які асудзіў краіну на збяднение і голад, набыло адкрытыя формы.

У Флярэнцыі, Мілане і іншых гаралах нядаўна мелі месца адкрытыя выступленні супроць фашысцкага рэжыма. Як паведамляе антыфашысцкая італьянская газета «Вочэ дэлі італьяні», якая выдаецца ў Парыжы, у Ферары ў час дэманстрацыі фільма, калі пагасла святло публіка пачала крычаць: «Далоў фашызм! Мусаліні асуджае нас на голад. Няхай жыве свабода!» Тут-жа былі зроблены масавыя арышты.

Бельгійская газета «Ле лібр бельжык» паведамляе аб разгроме магазінаў у Флярэнцыі.

Па ўсёй Італіі распаўсюджваюцца антыфашысцкія лістоўкі. «Вочэ дэлі італьяні» паведамляе, што перамога рэспубліканцаў пад Тэруэлем выклікала «велізарную радасць сярод працоўных Італіі».

Расце і шырыцца антыфашысцкі рух у Італіі. І ніякім тэрорам фашысцкім заправілам не ўдасца задавіць яго.

ГОФМАНСКІЯ ГЛАДЗІЛЬНЫЯ ПРАСЫ

Віцебскі машынна-будаўнічы завод «Комінтэрн» асвоіў вытворчасць механізаваных гофманскіх гладзільных прасаў для швейнай прамысловасці. У студзені выпушчаны першыя 8 прасаў, якія адгружаюцца менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік».

Гофманскія гладзільныя прасы пераводзяцца ў рух электраматорам і поўнасцю механізуюць уцюжку — вельмі працаёмкі працэс на швейных фабрыках.

У гэтым годзе завод дасць 200 такіх прасаў. Ад швейных фабрык РСФСР паступаюць заяўкі на выраб для іх гофманскіх прасаў.

—о—

НОВЫЯ ДАМЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

З года ў год у БССР расце сетка культурных устаноў на вёсцы. Па рэспубліцы налічваецца 92 раённыя дамы соцыялістычнай культуры, каля 600 калгасных клубаў і 1.430 хат-чытальняў. Многія з іх сталі сапраўднымі цэнтрамі агітацыйна-прапагандысцкай і культурна-масавай работы ў калгаснай вёсцы. У адным толькі Жлобінскім раёне ёсць 23 хаты-чытальні і 12 калгасных клубаў.

У гэтым годзе будуць пабудаваны новыя раённыя дамы соцкультуры ў Тураве, Слуцку і Чачэрску і дзве хаты-чытальні ў Бягомльскім і Заслаўскім раёнах. Кожны новы Дом соцкультуры будзе мець глядзельную залу з гукавой кіноўстаноўкай, ад 8 да 12 пакояў для гурткоўай і масавай работы і бібліятэку.

На палітыка-асветную работу ў вёсцы ў гэтым годзе Наркамасветы БССР намечана выдатковаць больш 7 мільёнаў рублёў.

—о—

КУРСЫ ДЛЯ СЕЛЬСОВЕЦКАГА АКТЫВА

ОРША. Пачалі сваю работу месячныя курсы сельсовецкага актыва, скліканыя аршанскім райвыканкомам. На курсах займаюцца 33 чалавекі, з іх 9 старшынь сельсоветаў і 5 сакратароў. Сярод курсантаў—ордэнаносцы тав. Палітыка (старшыня калгаса «Брыгадзір») і тав. Кедрава (адказная па ільну калгаса імя Карла Маркса).

У праграме курсаў — гісторыя ВКП(б), гісторыя народаў СССР, Канстытуцыі СССР і БССР, асновы совецкага права і задачы сельсоветаў.

ЗДАРЭННІ

У Менску, Па Радашкоўскай вуліцы, у доме № 27, які належыць рабочаму 2-га Клінічнага гарадка Церлюкевічу, узнік пажар. Агнём знішчан пакой і некаторыя хатнія рэчы. Пажар быў ліквідован прыбыўшай пажарнай камандай.

Устаноўлена, што Церлюкевіч сам падпаліў свой дом, каб атрымаць страхавую прэмію. Церлюкевіч прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАЛГАСН... ФІЗКУЛЬТУРНАЯ СПАРТАКІ...

У гонар XX гадавіны Чырвона... і Ваенна-Марскога Флота сёння ... ў парку культуры і адпачынку ... рыя былой выстаўкі) пачынаюц... беларускія калгасныя фізкультур... борніцтвы па зімовых відах спор... прымуць удзел 300 калгасных ... турнікаў з 30 раёнаў БССР.

У праграме — змешаная ваен... лыжная астафета 4×5 клм., пры... другім этапе эстафеты ўдзельніча... ключна жанчыны. Удзельнікі ... эстафеты — мужчыны—пойдуць з ... газамі і баявымі вінтоўкамі, жан... працівагазамі і санітарнымі сумк... Удзельнікі эстафеты прымуць ... стралковых спаборніцтвах з дробне... вай вінтоўкі на дыстанцыю 50 м...

Апрача гэтага, праводзяцца сп... твы на лыжах і каньках.

Мужчыны пройдуць на лыжах ... цыі ў 10 і 20 клм., для жанчын ... ны дыстанцыі ў 3 і 5 клм.

Калгасныя канькабежцы будуць ... нічаць на дыстанцыі ў 100, 500 ... метраў.

Спаборніцтвы працягнуцца да 9 ... Пераможцы атрымаюць імяныя ... ныя жэтоны і дыпломы.

10 лютага каманда пераможцаў ... ў Маскву на ўсесаюзныя калгасн... борніцтвы.

—о—

НА КАЛГАСНЫМ БАЗАРЫ

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Кар. «Звязды»). ... зарныя дні вялікая плошча ка... рынка ў г. Мсціслаўлі запаўняец... водамі. Амаль з усяго раёна з'яз... калгаснікі на базар. Яны прывозя... лавець лішкі сельскагаспадарчых ... таў, якіх багата атрымалі ў ... годзе на свае працадні.

На вазах стаяць поўныя мяхі ... Доўгімі радамі расцягнуліся пад ... сенам, саломай. Сталы завалены ... мясам, маслам, сырамі. У кошыках ... яйкі. Цэны на прадукты значна з... Напрыклад. цана за пуд жыт ... 12 рублёў, ячменю 12—14 руб., ... цы 15—16 руб. Кілограм свіно... каштуе 12 рублёў, дзесятак яек пр... па 3—3 руб. 50 кап.

Рэзка знізіліся цэны і на іншы... скагаспадарчыя прадукты.

За выручаныя грошы ад прода... дуктаў калгаснікі купляюць у м... зімовую вопратку. абутак, мэблю, ... пасуду, культтавары.

Дзённік

— 7 лютага ў 10 гадзін раніцы ... партактыва адбудзецца семінар з адр... вытворчасці для прапагандыстаў па ... ВКП(б) па наступных тэмах: III, VIII ...

— У 7 гадзін вечара адбудзецца к... цыя па гісторыі ВКП(б) і палітграма...

Намеснік адказнага рэд...
І. М. ОФЕНГЕЙ...

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
6 лютага
Абан. № 111
АПОШНІЯ

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗАПАРОЖАЦ ЗА ДУНАЕМ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
АРСЕН

Кінотэатр «Навіны дня» (памяшк. дзіцячага кінотэатра)
1) Дзве дэмакратыі.
2) Паўночная Осеція.
3) Свята ў тундры.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ПОЎНАЛЕЦЦЕ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
КЛЯТВА

ДА УВАГІ ПАРТЫЙНЫХ, СОВЕЦКІХ І ПРО... ЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ПАРТКАБ... КЛУБАЎ, ХАТ-ЧЫТАЛЬНЯЎ, ШКОЛ, ВНУ, ВАЙО... ЧАСЦЕЙ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ СПАЖЫЎЦОЎ.

АДДЗЕЛАМ ПАДПІСКІ КОГІЗ'а (гор. Менск, Совет...

АДКРЫТА ПАДПІСКА
НА КАМПЛЕКТЫ ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІН...
З ПРАМОВАЙ таварыша СТАЛІ...

НА ПРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ СТАЛІНСКАЙ ... гор. МАСКВЫ 11 снежня 1937 года, у Вялікім тэатры.

ЗАПІСАНАЙ НА 5 ДВУХБАКОВЫХ ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІН ...

Камплекты грампласцінак прамовы таварыша Сталіна аф... Ў ПРЫГОЖЫХ АЛЬБОМАХ. (Таксама выпускаюцца КАМПЛЕК... АЛЬБОМАЎ — У КАРАБКАХ).

ЦАНА камплекта грампласцінак у альбоме — 22 руб. ЗАДАТ... падпісцы — 10 руб.

Цана камплекта без альбома — 11 руб. 45 кап. ЗАДАТАК ... пісцы — 5 руб.

Да кожнага камплекта прыкладзена 100 грамафонных іголак... Камплекты грампласцінак паступяць для рассылкі падпісчы... сакавіку месяцы г. г.

Заказы і грошы шліце па адрасу: гор. Менск, Совецкая, 7... лу падпіскі КОГІЗ'а.

Падпіска таксама прымаецца ўсімі райаддзяленнямі і м... КОГІЗ'а ў гарадах: Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Оршы, ... ску, Барысаве, Рэчыцы, Слуцку, Мазыры, Лепелі, Полацку і ... чах і ўпаўнаважанымі аддзела падпіскі на мясцах пры прад... пасведчання.

Аддзел падпіскі КОГІЗ'а высылае НАЛОЖАНЫМ ПЛАЦЯЖ... атрыманні задатку ў 20 руб. — ДАКЛАД ТАВАРЫША СТАЛІ... VIII З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ, запісаны на грампласцінках. Цана — ... 40 кап.

1-ага лютага 1938 года ў г. Куйбышэве
Адбудзецца шосты тыраж
ВЫЙГРЫШАЎ ПА ЗАЙМУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ
(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)
У тыражы будзе разыграна 1 мільён 60 тысяч выйгрышаў на суму 173 мільёны 920 тысяч рублёў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352, сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзелаў; партыйнага — 21-353, совецкага 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846 культуры — 21-055, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-180, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стылярэдактуры — 21-556, аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—5332. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая 63. К., Л., Б. 1.